БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА




ЧЫРВОНАЯ ЧЗ ЗМЕНА

26 лютага 1994 г.
Субота
№ 23(13739)
Кошт у розніцу 50 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

Малюе Віктар ДУБОВІК



* * *

Трэці штогадовы фестываль моды прайшоў у сталіцы Літвы — горадзе Вільнюсе. Яго арганізатары адмовіліся ад крайнасцей моды, што пераважна было раней, і адабралі калекцыі, практычныя і насычаныя новымі ідэямі.



Фота ЭЛЬТА—БЕЛІНФАРМ.

Кур'ер "ЧЗ"

СТОП-ФАКТ

Прафсаюзы ў чаканні

24 лютага адбылося пасяджэнне прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, галоўным пытаннем якога стала абмеркаванне бягучага моманту і каардынацыі дзейнняў прафсаюзаў.

На пасяджэнні было адзначана, што рэакцыя кіраўніцтва рэспублікі на патрабаванні, якія былі вылучаны 10 лютага на рэспубліканскім сходзе прадстаўнікоў прафсаюзных арганізацый, — у прыватнасці, аб прызначэнні даты датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет, — зрушылася з мёртвага пункту: на сесіі Вярхоўнага Савета разглядаецца праект Закона аб выбарах, шэраг іншых пытанняў, уключаных у парадак дня сесіі, на якія ФПБ неаднаразова звяртала ўвагу парламента і ўрада.

Зыходзячы з гэтага, удзельнікі пасяджэння вырашылі ніякіх кардынальных дзеянняў пакуль не прадпрымаць. Арганізацыям, якія ўваходзяць у склад ФПБ, дадзена ўказанне правесці ў сваіх працоўных калектывах сходы з абмеркаваннем бягучага моманту і дзейнняў прафсаюзаў.

БелаПАН.

Ёсць магчымасць атрымаць нафту

Як стала вядома з дакладных крыніц, у сістэме магістральных нафтаправодаў накапілася звыш 8,6 млн.тон неразмеркаванай нафты, у тым ліку каля 2 млн.тон — на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах рэспублік былога Саюза.

Адзіным выйсцем з такога становішча, лічаць спецыялісты, можа стаць паскораная адкачка нафты ў аб'ёме да 2 млн.тон на Украіну і Беларусь. Пастаўкі мяркуецца ажыццявіць без папярэдняй аплаты спажыўца і на больш ільготных умовах праходжання мытных працэдур.

Анатоль РАМАНОВІЧ.

Яшчэ адна зорка

Здаецца, сольныя канцэрты беларускіх рок-зорак на радзіме становяцца ўжо добрай традыцыяй. Пачынанню "Крамы" мяркуе даць развіццё гурт "Новае неба".

Рок-каманда Касі Камоцкай — выдатны прадстаўнік беларускага жаночага альтэрнатыўнага рока, з творчасцю якога паспелі пазнаёміцца заўсёднікі канцэртных пляцовак Польшчы, Францыі, Даніі. Паводле вынікаў праведзенага агенцтвам "ЧЗ-інфарм" апытання вядучых рок-крытыкаў Беларусі салістка "Новага неба" стала адным з лідэраў у намінацыі "Рок-вакалістка-93", падзяліўшы першае месца з Нэлі Дзянісавай ("Зіндан").

Канцэрт, які адбудзецца 28 лютага (пачатак а 20-й гадзіне), пройдзе ў памяшканні Мінскага альтэрнатыўнага тэатра (вул.В.Харужай, 31а) у рамках традыцыйнага рок-абанемента.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

Пажар напярэдадні "Славянскага базару"

Ушчэнт выгарэў першы паверх рэстарана фешэнебельнай віцебскай гасцініцы "Ветразь".

На момант загарання (23 лютага каля 13.00) зала была закрыта, і таму, на шчасце, абышлося без людскіх ахвяр. Падраздзяленням пажарных часцей горада, якія падаспелі па выкліку, удалося паспяхова эвакуіраваць усіх наведвальнікаў другога паверха рэстарана, аднак самое памяшканне таксама падвергласяразбуральнаму ўздзеянню высокіх тэмператур.

Пажарныя дзейнічалі ў кіслародных процівагазах у ядавітым дыме: гарэлі пластмасавыя дэталі інтэр'ера, радыёапаратуры і сінтэтычная сіняя драпіроўка залы.

Спецыяльная следчая група распрацоўвае некалькі версій: ад самаадвольнага ўзгарання няспраўнай электраправодкі да наўмыснага падпалу.

Але ясна пакуль адно: гораду, які ўжо рыхтуецца да прыёму гасцей фестывалю "Славянскі базар-94", нанесены вялікі матэрыяльны ўрон.

БелаПАН.



Гэта чарга (на здымку) — не з галадаючых суайчыннікаў. Тут, у магазіне Крычаўскага таварыства райспажыўсаюза, прадаюць наш беларускі, вельмі смачнай выпечкі хлеб. Вось яго перакупшчыкі і вывозяць у Расію, у бліжэйшыя Раслаўль і Панятоўку, і прадаюць там за расійскія рублі. Тавар карыстаецца попытам. "Бізнес" квітнее, прыносячы немалы "навар".

Праўда, на мытні ў Крычаве часта арганізуюць рэйды і канфіскуюць гэты хлеб. Але, тым не менш, падобны гандаль не спыняецца.

Фота Валерыя БЫСАВА.

Курсы валют на 23 лютага:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	6700	–	3850	–
"Пошук"	6600	6900	3700	3900
"Прыор"	6700	7000	3820	4050

СПОРТ

Алімпійскі прынцып у дзеянні

Пасля вельмі ўдалага выступлення ў жаночым біятлонным спрынце нашых Святланы Парамыгінай і Ірыны Какуевай вынікі беларускіх біятланістаў на 10-кіламетровай трасе расчаравалі. Аляксандр Папоў заняў 10-е месца з вынікам 29.38,5 (о), Алег Рыжанкоў стаў семнаццатым, Віктар Майгураў — 37-м, Ігар Хахракоў — толькі 45-м. З вынікам 28.07.О (о) перамог расіянін Сяргей Чэпікаў, серабро ў Рыка Гроса з Германіі, трэці таксама расіянін Сяргей Тарасаў.

На наступны дзень, 24 лютага, рухнулі нашы спадзяванні на медаль у фрыстайле. У фінальных акрабатычных скачках Аляксей Парфянкоў стаў горшым з дванаццаці лепшых, ён набраў толькі 178,48 ачка. Перамог швейцарац Шон Бахлер (234,67). Сярод жанчын перамагла Ліна Чыразава з Узбекістана (166,84), а наша Юлія Раковіч — на 10-м месцы (135,53).

Лыжніцы беглі 30 км класічным стылем. З часам 1.25.41,6 перамагла Мануэла дзі Чэнта (Італія), на другім месцы — нарвежка Марыт Уолт, трэцяя — фінка Мар'я-Ліса Кірвісніемі. Наша Алена Сінькевіч паказала 22-гі вынік (1.31.47,8), Святлана Камоцкая — 44-я (1.36.51,0).

Учора адбылася жаночая біятлонная эстафета 4 х 7,5 км, якая зусім расчаравала беларускіх балельшчыкаў. Выдатна стартавала на першым этапе Ірына Какуева і... адразу ж правалілася ў стральбе лежачы, дапусціўшы чатыры промахі, па два разы памыліліся Наталля Пермякова і Наталля Рыжанкова. Не падвяла толькі Святлана Парамыгіна: паразіла ўсе мішэні і вывела каманду на шостае месца. Агульны вынік зборнай Беларусі — 1.54.55,1 (8). Нечакана перамагла расійская каманда — 1.47.19,5 (о). Следам фінішавалі біятланісткі Германіі і Францыі.

Яўген Пучкоў.

ВЕСТКІ З ПАРЛАМЕНТА

Да прэзідэнцтва ўсё бліжэй

Вольга ШАЎКО, "ЧЗ"

Мяркуючы па колькасці заканадаўчых актаў, якія парламент прыняў на гэтым тыдні, вытворчасць яго працы можна назваць узорнай. Хаця большасць гэтых законаў наўрад ці можна лічыць вызначальнымі для рэспублікі, усё ж дэпутаты дэманстравалі непрывычную для Авальнай залы дысцыплінаванасць і мэтанакіраванасць. Спачатку шэраг новых прызначэнняў на адказныя пасады, потым вынік амаль кожнага галасавання: "Рашэнне прынята" — усё ішло без сучка і задзірынкі. Праўда, па самых галоўных пытаннях дамаўляцца яшчэ прыйдзецца.

З цяжкасцю ішло рэфарміраванне "Закона аб выбарах народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь", абмеркаванне якога працягвалася ўчора. Парламентарыі ніяк не маглі прыйсці да згоды ў пытанні, каму даць права на вылучэнне кандыдатаў у народныя дэпутаты. Дэбаты разгарэліся, калі з гэтага спіса выпалі палітычныя партыі, а прадстаўнікі ветэранаў настойвалі на праве вылучэння ў кандыдаты ад сваіх арганізацый. Без цырымоній было прапанавана абысціся з вайскоўцамі, якіх, на її думку Леаніда Баршчэўскага, трэба пазбавіць права на вылучэнне сваіх кандыдатаў, бо ў арміі забаронена палітычная агітацыя.

Карацей, старшыні Камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву Уладзіміру Леўчыку нічога не заставалася, як прапанаваць правесці кансультацыі з камісіямі Вярхоўнага Савета і вярнуцца да абмеркавання Закона аб выбарах на наступных пасяджэннях. Калі пішуцца гэтыя радкі, дэбаты яшчэ працягваюцца, і мы не можам паведаміць пра іх вынік.

Самым адчувальным дэпутацкім дасягненнем на гэтым тыдні, бадай, можна лічыць сур'ёзны крок наперад у рабоце над праектам новай Канстытуцыі. Як вядома, ужо галасаванне па асобных яе раздзелах будзе ісці тры дні пры дапамозе імянных бюлетэняў і закончыцца ў аўторак вечарам. Такая працэдура, верагодна, дапаможа вырашыць праблемы, па якіх ніяк не ўдаецца знайсці палітычнага прымірэння. Асабліва гэта датычыць раздзела будучага дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, у прыватнасці, інстытута прэзідэнцтва. Лічаныя галасы, якіх раней не хапала для прыняцця канстытуцыйных артыкулаў, трэба думаць, за трохдзённы тэрмін усё ж знойдуць сваё месца пры выніковай раскладцы палітычных думак.

Апазіцыя ж такую форму галасавання абвергла зусім і выступіла з "заявай сарака", дзе папярэдзіла, што ўдзельнічаць у галасаванні не будзе. Яе лідэр Зянон Пазьняк назваў працэдуру з імяннымі бюлетэнямі спробай увесці прэзідэнцкую ўладу нелегальным шляхам.

На гэтым жа тыдні журналісты атрымалі праект пастановы Вярхоўнага Савета аб правядзенні выбараў. Дата іх папярэдне прызначана на 20 лістапада.


Учора, як заўсёды, у дэпутатаў быў скарочаны парламенцкі дзень. Аднадушна яны прагаласавалі за тое, каб працаваць да дзвюх гадзін дня.

Сесія прадоўжыць сваю работу ў аўторак. Тады ж мы даведаемся пра лёс Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь.

■

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

"Еўраньюс" — "Суперчэннэл" — "TV-5" — "Уорлднэт"



Дзяжурныя па выпуску: перакладчыкі С. КІРЫЕНКА, Д. ЛІТВІН, рэдактар П. СІМАНАЎ.

У АДЧАЙНЫМ СТАНОВІШЧЫ

5 чалавек забіты і 16 паранены ў выніку выбуху рэактыўнага снарада на тэрыторыі шпіталя на поўначы Босніі.

Гэты раён знаходзіцца ў адчайным становішчы ў выніку сербска-харвацкіх абстрэлаў. Падвезці медыкаменты і прадукты харчавання ў горад вельмі складана.

ДАЛЕЙ АД ЭКСКУРСІЙ

Ісламскі рух заклікаў егіпцян часова ўстрымацца ад наведвання банкаў і ўдзелу ў турыстычных экскурсіях у сувязі з павышанай рызыкай тэрарыстычных актаў.

Папярэджанне было апублікавана пасля выбухаў у цягніку "Каір—Асуан" (11 чалавек паранены) і перад будынкам нацыянальнага банка ў сталіцы Егіпта.

НЯЎМОЛЬНАЯ ГРЭЦЫЯ

Спецыяльная камісія ў Бруселі так і не здолела вырашыць канфлікт, які ўзнік з-за прынятага Афінамі на мінулым тыдні рашэння аб увядзенні эканамічнай блакады Македоніі.

Грэчаскі міністр замежных спраў заявіў, што пакуль Македонія не выканае ўмовы Афінаў аб адмене ўласнага сцяга і перайменаванні краіны, ніякай размовы аб спыненні канфлікту быць не можа.

ВЕНГРЫЯ ХОЧА Ў ЕС

Венгерскі прэм'ер-міністр Борас заявіў, што яго краіна разглядае магчымасць далучэння да Еўрапейскай супольнасці ў чэрвені гэтага года.

Праўда, ён удакладніў, што ў цяперашняй эканамічнай сітуацыі Венгрыя пакуль не зможа стаць паўнапраўным членам супольніцтва.

"СУЗУКІ" КАНФЛІКТУЕ З ІСПАНЦАМІ

З кожным днём пагаршаецца сітуацыя ў Еўрапейскай аўтамабільнай прамысловасці. Чарговая забастоўка адбылася ў Іспаніі. У ёй прынялі ўдзел каля 30 тысяч працоўных аўтамабільных канцэрнаў.

Яны выказаліся супраць таго, што японскі аўтамабільны канцэрн "Сузукі" хоча пачаць будаўніцтва аўтазавода ў Іспанскім горадзе Лінарысе. У параўнанні з еўрапейскімі японскія аўтамабілі ў Еўропе каштуюць намнога танней. Іспанскі ўрад мае намер умяшацца ў канфлікт.

КАПІТАН–ЗАБОЙЦА

У чацвер быў аддадзены пад суд капітан судна, вінаваты ў інцыдэнце, які адбыўся ля берагоў Фларыды.

Бежанцы з Гаіці — мужчына, жанчына і двое маленькіх дзяцей патанулі пасля таго, як падсудны загадаў высадзіць іх за борт недалёка ад берага.

ТРАГЕДЫЯ Ў АКІЯНЕ

Недалёка ад Багамскіх астравоў патанула судна, якое таксама перавозіла бежанцаў з Гаіці.

Больш як 25 чалавек да гэтага часу лічацца прапаўшымі без вестак. Ёсць апасенні, што ўсе яны загінулі. На беразе былі знойдзены 5 згрызеных акуламі целаў бежанцаў і толькі шасцярым удалося шчасліва дасягнуць берага.

(Працяг на 3-й стар.).

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"



БІЗНЕС-КЛАС

Вядучая рубрыкі Вера ПАЛЯКОВА
Тэл. 68-28-52

А гандляваць, аказваецца, можам

Відаць, беларуская прадукцыя ўсё больш прыходзіцца па душы замежным спажыўцам. Паводле звестак, атрыманых у Дзяржаўным камітэце рэспублікі па знешніх эканамічных сувязях, знешнегандлёвы абарот у студзені ў параўнанні з аналагічным месяцам мінулага года павялічыўся больш чым на тры працэнты і склаў звыш 96 мільёнаў даляраў ЗША. Пры гэтым экспарт павысіўся амаль на 30, а імпарт знізіўся на 25,1 працэнта. Прыемна таксама адзначыць, што сальда знешняга гандлю — станоўчае. Яно павялічылася амаль у дзесяць разоў і склала 28,5 мільёна даляраў.

Радуе, што па-ранейшаму захоўваюцца добрыя гандлёвыя адносіны ў рэспубліцы з еўрапейскімі краінамі. Вялікім попытам пачала карыстацца наша прадукцыя ў Швейцарыі, Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Аўстрыі і іншых дзяржавах. Асабліва павялічыліся пастаўкі за мяжу трактароў, калійных угнаенняў, матацыклаў, бытавых гадзіннікаў.

Былі б алмазы!

Шляхі магчымага супрацоўніцтва па пошуку алмазных радовішчаў на тэрыторыі Беларусі абмеркаваны ў Дзяржаўным камітэце рэспублікі па знешніх эканамічных сувязях і ў вытворчым аб'яднанні "Беларусгеалогія" з прадстаўнікамі буйной аўстрыйскай кампаніі "Эштан Майнінг Лімітэд". У час гутарак госці падзяліліся вопытам сваёй работы ў ЗША, Канадзе, Расіі, Кітаі і іншых краінах. Нашы спецыялісты расказалі замежным калегам пра першыя вынікі даследаванняў. Пакуль яны толькі абнадзейваюць. І ўжо цяпер гавораць пра нейкія залежы ў нас каштоўных камянёў яшчэ рана. Як кажуць у такіх выпадках, пажывём — убачым. Але, нягледзячы на гэта, паміж беларускімі і аўстрыйскімі геолагамі была дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб падтрыманні дзелавых кантактаў.

БЕЛІНФАРМ.

Душ ... у магазіне

Фірменны магазін сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства "Белвест" адкрыўся ў Оршы.

Шыкоўны знешні выгляд будынка, белая мармуровая яго абліцоўка, высокая столь і яркае асвятленне гандлёвай залы, мноства кветак і люстэркаў — усё гэта пакідае непаўторнае ўражанне ў наведвальнікаў магазіна. Далёка не кожны нават буйны магазін можа пахваліцца сёння і такімі ўмовамі для прадаўцоў: ёсць тут кухня, пакой адпачынку, душ. Ну, і вядома ж, сама прадукцыя прадпрыемства на паліцах. Дарэчы, цэны на абутак увогуле прымальныя, хай сабе і не зусім смешныя.

За 5 гадоў дзейнасці СП "Белвест" прадукцыя яго стала добра вядомая не толькі ў нас у рэспубліцы, але і за яе межамі, дзе таксама адкрыты фірменныя магазіны.

Сяргей ВІШНЕЎСКІ.

1994 ГОД – год сабакі і... бухгалтара

1994 год можна смела назваць годам бухгалтара. Я думаю, што мае калегі і тыя, хто цікавіцца гісторыяй, пагодзяцца са мной. Па-першае, 500 год таму ўбачыла свет кніга венецыянскага купца Лукі Пачолі "Сума арыфметыкі, геаметрыі, вучэнне аб прапорцыях і зносінах", адзінаццаты трактат якой – "Аб рахунках і запісах" – з'явіўся першай тэарэтычнай працай па бухгалтарскаму ўліку.

Па-другое, 50 год таму, у 1994 годзе француз Жан Батыст Дзюмаршэ прыдумаў міжнародны герб бухгалтараў, складзены з трох фігур: сонца – бухгалтарскі ўлік асвятляе гаспадарчую дзейнасць; вагаў – баланс; крывой Бернулі – сімвалізуючай тое, што ўлік, аднойчы ўзнікнуўшы, будзе існаваць заўжды і дэвіза "навука, давер, незалежнасць". (Герб зацверджаны міжнародным кангрэсам бухгалтараў у 1946 годзе).

Трэцяя з'ява можа адбыцца ўжо сёлета, калі наш Вярхоўны Савет прыме Закон "Аб бухгалтарскім уліку ў Рэспубліцы Беларусь". Балазе, ён прыняты ўжо ў першым чытанні.

Але зноў вернемся да самай урачыстай падзеі – 500-годдзя выхаду ў свет першай працы па бухгалтарскаму ўліку.

У сённяшні нялёгкі час, калі ўсяму грамадству "не да раскошы", асабліва нялёгка на бухгалтарскім "мосціку". Несціхаючы шторм падатковага заканадаўства, які штогод змяняецца, з тысячамі паправак – адно, што непакоіць больш, чым любы зубны боль.

Сяргей СКАМАРОХ, бухгалтар.

"ПАС" — палітыка-аналітычная служба

Асноўныя формы выбарчых сістэм ва ўмовах дэмакратыі

□ Аляксандр ГРАЧ

На адной з апошніх сустрэч з працаўнікамі вёскі Старшыня Вярхоўнага Савета М.Грыб сказаў аб тым, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета распрацаваў цэлую стратэгію развіцця дзяржаўных структур на Беларусі. Асноўнае месца ў гэтай стратэгіі адводзіцца ўдаламу спалучэнню механізма выбараў з захаваннем стабільнасці ўлады. З гэтай мэтай плануецца правядзенне (калі Вярхоўны Савет прыме такое рашэнне) ужо ў бліжэйшы час прэзідэнцкіх выбараў, якія павінны стаць асновай для правядзення парламенцкіх выбараў ва ўмовах стабільнай выканаўчай улады. Выбары прэзідэнта краіны, выбары парламенцкія маюць сваю спецыфіку, якая вынікае з функцыянальнай сутнасці названых інстытутаў.

Агульнанацыянальныя выбары прэзідэнта маюць на мэце вызначыць чалавека, здольнага адлюстроўваць інтарэсы нацыі, яе перспектыву. Найбольш эфектыўнай выбарчай сістэмай у гэтым выпадку з'яўляецца мажарытарная, заснаваная на прынцыпе выбыцця канкурэнтаў, паколькі выбраным лічыцца кандыдат, які сабраў простую большасць галасоў, гэта значыць 50 працэнтаў плюс адзін голас. Каб адлюстраваць важнасць выбару, гэтая сістэма дапускае розныя варыянты, напрыклад, яна можа прадугледжваць некалькі этапаў галасавання. На першым этапе вызначаюцца два прэтэндэнты, якія набралі большасць галасоў. На другім — галасаванне павінна даць адказ, хто з іх пераможа. Такая форма выбараў дае магчымасць выбаршчыкам, якія аддалі свае галасы за выбыўшых прэтэндэнтаў, ізноў скарыстаць права выбару. Іменна па такой сістэме праходзілі нядаўнія прэзідэнцкія выбары ў Фінляндыі. Многае ў мажарытарнай сістэме выбараў залежыць ад колькасці прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта. Скажам, калі іх з самага пачатку два, то дастаткова аднаго этапа выбараў. Такая сітуацыя, дарэчы, была пры абранні прэзідэнта ЗША Б.Клінтана, паколькі незалежны непартыйны прэтэндэнт зняў сваю кандыдатуру яшчэ перад выбарамі.

Выбары чарговага складу парламента не могуць праводзіцца па мажарытарнай сістэме, таму, што гэты заканадаўчы орган з'яўляецца прадстаўнічым, гэта значыць ён павінен максімальна адлюстроўваць інтарэсы розных груп насельніцтва краіны, натуральна, з улікам таго, што ўсе гэтыя групы прызнаюць каштоўнасці дэмакратыі і не будуць выкарыстоўваць выбары для іншых мэт. Шырокае прадстаўніцтва пад час выбараў у парламент можа забяспечыць прапарцыянальная выбарчая сістэма. Пры гэтай сістэме ні адзін прэтэндэнт не выбывае (маюцца на ўвазе партыі). Проста па выніках галасавання, з улікам атрыманай працэнтнай колькасці галасоў палітычная партыя атрымлівае суадносную колькасць дэпутацкіх месцаў у парламенце. Напрыклад, у парламенце 350 дэпутацкіх месцаў. Партыя набрала па выніках галасавання 60 працэнтаў галасоў. Значыць, яна атрымае 210 месцаў, якія зоймуць названыя ў партыйным спісе прэтэндэнты. Калі ў краіне вялікая колькасць палітычных партый і яны не карыстаюцца ў аднолькавай ступені папулярнасцю, то каб зрабіць выбары выніковымі з пункту гледжання працаздольнасці парламента (каб у яго трапілі толькі буйныя партыі), уводзіцца 5-працэнтны бар'ер набраных галасоў выбаршчыкаў, гэта значыць, што палітычныя партыі, якія не набралі 5 працэнтаў галасоў не трапляюць у парламент і ім застаецца магчымасць толькі рыхтавацца да чарговых выбараў, каб пераадолець гэты бар'ер.

Існуючая цяпер у Беларусі сітуацыя вельмі падобная на значаны варыянт выбараў. Трэба ўлічваць і іншае. Парламенцкі статус многіх партый вызначыцца толькі пасля выбараў, паколькі ўплыў любой парламенцкай партыі вызначаецца не толькі колькасцю яе членаў, але і колькасцю сталых яе выбаршчыкаў. Вось чаму ў Беларусі патрэбны парламенцкія выбары.

Аматары чацвераногіх сяброў маглі назіраць за прыгажосцю і звычкамі сваіх гадаванцаў на выстаўцы сабак, якая прайшла ў Мінску. Тут былі прадстаўлены чыста рускія пароды, а таксама самыя рэдкія і незвычайныя. Сярод іх — масціна неапалітана, стафардшырскі тэр'ер, англійскі бульдог.

На выстаўцы можна было на свае вочы пераканацца, якія адданыя адзін аднаму гаспадары і іх гадаванцы.

Фота Веры ВАСІЛЕЎСКАЙ, БЕЛІНФАРМ.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

ЧАЛАВЕК ПРЫЙШОЎ... ПА ДАВЕДКУ

Чалавек прыйшоў па даведку. Скажам, трэба пацвердзіць аднаму чыноўніку з дапамогай другога, што чалавек сапраўды пражывае ў горадзе Брэсце па вуліцы Кірава ў доме нумар шаснаццаць. І калі трапіш на добрасумленнага і чулага выканаўцу, то ён падобную даведку хвілін за пяць выпіша.

Аднак бываюць даведкі, якіх адразу не складзеш. У аддзеле сацыяльнай абароны дзяцінства абласнога ўпраўлення адукацыі захаваліся спісы ўсіх выхаванцаў інтэрнацкіх устаноў, пачынаючы з 1945 года.

Цяпер, калі дзяржава вызначыла для выхаванцаў пэўныя ільготы, ідуць і ідуць у аддзел пісьмы.

Самымі складанымі, на мой погляд, аказваюцца сёння даведкі былым малалетнім вязням фашысцкіх лагераў. Справа ў тым, што пакуль няма афіцыйнага месца, дзе былі б сканцэнтраваны ўсе дакументы па гэтай катэгорыі льготнікаў. У архівах можна часам выявіць спіс дзяцей, прывезеных у канцы вайны з Польшчы ці Германіі, у абласным упраўленні адукацыі — накіраванне ў інтэрнат, у Камітэце бяспекі — пратакол суда над фашыстамі, на якім малалетні вязень выступаў у ролі сведкі.

Калі пашчасціць, то чалавек з цягам часу атрымае пэўную даведку. Але часцей за ўсё ў яго адрас паляціць адпіска: наша ведамства не мае звестак пра Вас.

Вось і прыходзіцца некаторым старым людзям месяцамі пісаць і прасіць розныя інстанцыі даслаць даведку аб знаходжанні іх у фашысцкіх засценках. І чакаць... чакаць, не страціўшы надзеі.

Таму так патрэбна ў вобласці спецыяльная служба — невялічкі аддзел ці камісія — па справах былых малалетніх вязняў фашысцкіх лагераў і выхаванцаў школ-інтэрнатаў. Яна магла б існаваць пры ўпраўленні адукацыі ці пры абласным архіве, ці пры ўпраўленні па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, ці пры КДБ...

Сканцэнтраваўшы ў адных руках усе дакументы, можна было б скласці алфавітныя спісы і картачкі па кожнаму вязню і выхаванцу. Потым гэтыя звесткі закласці ва ўчэпістую памяць камп'ютэра, што значна паскорыла б пошук.

Павел БЕНЬ.

ШТО РАБІЦЬ?

Дык што ж рабіць? Гэта спрадвечнае пытанне стаіць перад намі. Не спадзеючыся знайсці адказ, айчынныя рэфарматары кінулі погляд на Захад і сказалі: "Няма чаго выдумляць, давайце зробім у нас так, як у іх". Намалявалі, груба кажучы, клетачкі, злучылі іх стрэлкамі-сувязямі і пачалі гэтыя клетачкі з дапамогай загадаў, законаў, пастаноў, інструкцый запаўняць новымі структурамі, падаткамі, свабодамі, продажамі, прыватызацыямі. Усе гэтыя структуры, адносіны і да таго падобнае, здавалася б, нядрэнна працуюць на Захадзе — вунь, як у іх вітрыны ломяцца ад цудоўных тавараў. Аднак у нас, як толькі запоўняць клетачку, — на наступны ж дзень глупства атрымліваецца, калі не горш.

Вольныя цэны скарацілі аб'ём нашай вытворчасці і дапамаглі Захаду перакінуць свае тавары да нас, і гэтым самым змякчыць вынікі нарастаючага эканамічнага крызісу. Мізэрнае дзяржаўнае фінансаванне навукі дало магчымасць укамплектаваць замежныя даследчыя цэнтры беларускімі кадрамі, а ўласныя цэнтры часам ледзь існуюць, ды і то, часта за кошт нелегальнай здачы памяшканняў камерсантам. Хацелі хуценька забяспечыць усіх жыллём, аднак замест росту колькасць пабудаваных кватэр скарацілася, і даступны яны толькі багачам. Марылі накарміць Беларусь з дапамогай фермераў, а фактычна кормяць нас "таталітарныя" калгасы і саўгасы. Збіраюцца ўвесці страхавую медыцыну, але народ ужо выміpae, ды і медыкі супраць. Замест прыватызацыі расцвілі "прыхватызацыя" і крадзеж. Хоць светлыя вучоныя галовы сцвярджаюць, быццам чалавек, стаўшы ўласнікам, сам у сябе красці не будзе. І так да бясконцасці.

Урад карыстаецца паслугамі заходніх кансультантаў, робіць амаль усё, што раіць Міжнародны Валютны Фонд (МВФ), але замест дасягнення ззяючых вяршынь багацця ўсюды пачала ззяць бездань беднаты. А за акіянам з дапамогай камп'ютэрных мадэлей эканомікі дакладна прадказваюць вынікі любога прынятага ў Беларусі рашэння.

Браць за прыклад заходняе грамадства — бессэнсоўная справа. Зразумець напрацаваныя заходнія эканамічныя мадэлі мы не ў стане. Кітайскі шлях, які пад кіраўніцтвам камуністаў дае 10—15-працэнтны рост аб'ёмаў вытворчасці, мы прапусцілі. Застаецца толькі знайсці свой уласны шлях развіцця.

Няўжо, маючы дзесяткі тысяч нядрэнных, па сутнасці, спецыялістаў па эканоміцы, кіраванню на вытворчасці, у навуцы, дзяржаўных і савецкіх органах, гэта немагчыма зрабіць? Але і іншага шляху няма. Памыліцца яшчэ раз, запаўняючы клетачкі-схемы, далёкія ад рэальнага стану грамадства, ніхто не мае права. Другі захад павінен быць паспяховым. Але ў нас можа быць і трэці захад, і чацвёрты, і гэтак да бясконцасці. У нас, у Беларусі, усё магчыма: народ беларускі цярплівы, прывучаны чакаць лепшых часоў доўга.

Вячаслаў ІШЧАНКА.

ГІСТАРЫЁГРАФ

Раскольніцкая "сталіца"

□ Аляксандр РОГАЛЕЎ

Раённы цэнтр Гомельскай вобласці горад Ветка ўзнік у апошняй чвэрці XVII ст., а калі быць дакладным, то ў 1685 г. Да гэтага часу веткаўскія наваколлі ўяўлялі сабой пустэльную лясную мясцовасць. Але ў названы час сюды прыйшлі людзі ў вялікай колькасці, і потым, на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, прыбывалі яшчэ і яшчэ. Вельмі хутка яны пабудавалі не толькі цэнтр — менавіта Ветку, але і шэраг суседніх пасяленняў. З гэтага моманту і пачынаецца веткаўская гісторыя, адна з самых цікавых, своеасаблівых і нетрадыцыйных гісторый для палескіх мястэчак...

Уніфікацыя царкоўных абрадаў, стварэнне новай дваранскай рускай царквы і знішчэнне рускай старадаўнасці, асвячонай і апраўданай традыцыяй, сустрэлі праціўборства з боку служыцеляў старой веры. Гэтае праціўборства было падтрымана рэшткамі разрозненага баярства, а таксама сялянскімі масамі. Сяляне не вельмі добра разумелі спрэчкі аб правільнасці або няправільнасці старых набажэнскіх кніг і іх моўных формул. Але паколькі рэформа праводзілася Масквой, і патрыярхам, і царом, ад якіх ішлі ўсе іншыя праявы прыгнёту, сяляне адразу згадзіліся падтрымаць сваіх мясцовых свяшчэннікаў і далучыліся да агульнага руху.

Праявамі гэтага руху былі салавецкі бунт 1668-1676 гг., а таксама не менш славутая хаваншчына.

Аднак найбольш істотнай праявай агульнага руху з'явіліся ўцёкі вялікай колькасці сялян у незаселеныя землі, у лясы і балоты. Такім чынам, яны ратавалі не столькі старую веру, колькі саміх сябе ад дзікага прыгнёту памешчыкаў. Гэтыя ўцёкі пагражалі дзяржаве не менш чым узброенай барацьбой, бо сяляне пакідалі памешчыка галодным, а казну пустой. Таму царскія войскі нярэдка вярталі перасяленцаў, каралі іх бязлітасна.

Уцёкі сялян па свайму гаспадарчаму і сацыяльнаму характару былі сапраўднай каланізацыяй некранутых лясных пустэч і неабжытых тэрыторый. Уцекачы знаходзілі звычайна сярод балот астравок цвёрдай зямлі, праводзілі да яго вузенькую сцежку праз дрыгву і старанна яе маскіравалі. Так узнікаў скіт. Паступова сюды сыходзіўся народ, які абзаводзіўся гаспадаркай.

Найбольш заможныя прыхільнікі старой веры ўцякалі за межы Маскоўскай дзяржавы, на тэрыторыю Рэчы Паспалітай, граніца з якой у XVII ст. праходзіла прыкладна па ўсходніх рубяжах сённяшняй Беларусі. Польскія магнаты з задавальненнем прымалі маскавітаў-старавераў і ахвотна прадастаўлялі ім ільготы, бо былі зацікаўлены ў засяленні сваіх вялікіх і пустэльных уладанняў. Старавеpы плацілі добра, прыносілі магнатам даходы, набывалі зямлю ва ўласнасць ці бралі яе ў арэнду. За гэта патрабавалі, каб ніхто не ўмешваўся ў іх справы, каб яны маглі жыць тут "без всякого утеснения от панов и от ксендзов, и от попов, и от мужиков, и от всякого чина", "без всякого поругания и порицания".

Некалькі груп стараавераў-перасяленцаў з розных гарадоў Русі ў 70-я гады XVII ст. заснавалі слабоды паблізу Старадуба на Браншчыне, ля самай граніцы Масковіі з Вялікім княствам Літоўскім. Пасля 1682 г., у час царавання Соф'і, калі значна ўзмацніліся набегі вайсковых атрадаў на пасяленні раскольнікаў, частка апошніх на чале з папамі Касьмой і Стэфанам вымушана была перайсці на польскую тэрыторыю і атабарылася ў недаступным і глухім месцы на адлегласці 15 вёрст ад рускай граніцы. Землі гэтыя належалі манастырскаму ваяводу Халецкаму, які з радасцю сустрэў стараавераў і не чыніў ім ніякіх перашкод. А старавеpы тым часам аблюбавалі пустэльны востраў, які быў утвораны рукавом ракі Сож. Гэтае адгалінаванне ракі па-мясцоваму называлася в е т к а й. Данае абазначэнне было перанесена раскольнікамі і на востраў. А калі на гэтым востраве яны пабудавалі сваю першую слабаду, то і яе назвалі проста В е т к а й. Адбылося гэта ў 1685 г.

НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА

У чужым небе

□ Барыс НАЛІВАЙКА

Было лета 1950 года. На далёкім Карэйскім паўвостраве палала вайна. А разгарэлася яна за манапольнае права двух урадаў – Поўначы і Поўдня – непадзельна ўладарыць усёй краінай, падзеленай 38-й паралеллю.

Калі ўзброеныя сілы ЗША і іншых дзяржаў пад міратворчым сцягам ААН пачалі інтэрвенцыю супраць КНДР, у баявыя дзеянні на баку Поўначы ўступілі лётчыкі Савецкага Саюза. У адкрытым друку пра паветраныя паядынкі нашых пілотаў з амерыканскімі асамі ў той час з-за цэнзурных абмежаванняў не пісалі. Таму вайна гэта і засталася для людзей невядомай.

Па службовых абавязках аўтару гэтых радкоў прыходзілася сустракацца з лётчыкамі, якія ваявалі ў карэйскім небе. Нядаўняя сустрэча з мінчанінам Л.К.Шчукіным, які ўдастоены медаля "Залатая Зорка" Героя, і яго аднапалчанамі нібы ажывіла далёкія падзеі ў чужым небе.

Пасля Айчыннай вайны Леў Кірылавіч трапіў у 18-ы гвардзейскі авіяполк, авалодваў тэхнікай пілатавання новых рэактыўных знішчальнікаў.

Аднаго разу восенню, калі Шчукін быў ужо камандзірам звяна, у полк прыбыў генерал і, сабраўшы лётчыкаў, пад вялікім сакрэтам паведаміў ім аб рашэнні ўрада СССР накіраваць полк у Паўночную Карэю, каб дапамагчы народу КНДР у яго барацьбе супраць паўднёвакарэйскіх войскаў і інтэрвентаў. У той жа час перад лётчыкамі адкрывалася магчымасць выпрабаваць у баях айчынную рэактыўную тэхніку, праверыць сваё майстэрства.

Разманціраваныя "мігі" пагрузілі на платформы, замаскіравалі. Самі ж лётчыкі ўладкаваліся ў купэ пасажырскіх вагонаў. У адным з іх разам са Шчукіным ехалі мінчане Мікалай Карніенка і Аляксей Свінціцкі, бабруйчанін Яўген Стэльмах, адэсіт Аляксей Калюжны... У большасці з іх ззялі на грудзях баявыя ордэны – узнагароды за подзвігі ў баях з лётчыкамі германскіх люфтвафэ.

Эшалон спыніўся непадалёк ад Усурыйска. Знішчальнікі хутка сабралі. Пачаліся трэніровачныя палёты.

9 мая 1951 года гвардзейцы па традыцыі рыхтаваліся адзначыць Дзень Перамогі. Аднак паступіла каманда пераляцець на тэрыторыю Кітая, і полк узяў накірунак на Аньдун, дзе базіраваліся палкі з дывізіі тройчы Героя Савецкага Саюза Івана Кажадуба.

Праз некалькі дзён яны пачулі каманду з КП:

– У паветры В-29. Першай эскадрыллі – узлёт!

Бамбардзіроўшчыкі, відаць, нацэльваліся на аэрадром Аньдун.

Лётчыкі звяна Шчукіна схапіліся з праціўнікам. Па адных ужо манеўрах заакіянскіх асаў адчувалася іх сіла. У падобнай сутычцы з імі любая памылка магла стаць пагібельнай.

У тым жа баі нашы збілі адзін самалёт. Яшчэ тры-чатыры бамбардзіроўшчыкі пашкодзілі. Аднак самым важным аказаўся той факт, што экіпажам праціўніка не ўдалося скінуць бомбавы груз прыцэльна. Нашы лётчыкі прымусілі іх вярнуцца ні з чым.

Не абышлося без пашкоджанняў і на "мігах". Гэта натуральна: яны ляцелі скрозь шквальны кулямётны агонь.

Збіты амерыканскі бамбардзіроўшчык захаплення ў лётчыкаў не выклікаў. Далёка не ўсім было зразумела, чаму нядаўнія саюзнікі па разгрому фашысцкай Германіі аказаліся па розныя бакі барыкад. Там, у верхніх эшалонах улады, нешта не падзялілі, а тут, у чужым небе, маладыя і дужыя хлопцы дзвюх дзяржаў павінны былі аддаваць сваё жыццё, каб задаволіць чыесьці амбіцыі. Тут жа, у Карэі, лілася кроў, памнажалася колькасць ахвяр.

Цяжкасцей у нашых лётчыкаў было шмат. У чаканні сігналу на вылет яны вымушаны былі доўгі час знаходзіцца ў кабінах знішчальнікаў. Нязвыклая гарачыня і вільготнасць у гэтай краіне вельмі стамлялі авіятараў, і кожны бой, кожная перамога даваліся ім цаной велізарных намаганняў. Гэтыя цяжкасці дапаўняліся тым, што нашым лётчыкам забаранялася перасякаць 38-ю паралель, а таксама весці баявыя дзеянні над морам. Тым не менш, нашы паветраныя байцы наносілі авіяцыі праціўніка адчувальныя страты. Гінулі амерыканцы, не абыходзілася без страт і ў нас.

У адным з баёў Леў Шчукін быў паранены. Куля трапіла ў твар. Кіраванне на самалёце было перабіта. Прыйшлося катапультавацца.

Пасля шпіталю Шчукін вярнуўся ў строй, зноў лятаў і ваяваў. Ён верыў у свае сілы, вёў па-майстэрску бай, і лік збітых ім самалётаў праціўніка прыкметна вырас. У гэтым была немалая заслуга і яго вернага "шчыта" Віктара Акатава. Адзін з наступных вылетаў, на жаль, аказаўся для яго апошнім.

11 снежня 1952 года капітан Шчукін пайшоў у свой апошні, 121-ы, баявы вылет. У той дзень заакіянскія асы рваліся да ахоўваемага аб'екта вялікімі сіламі. У скарацечнай схватцы, разгадаўшы хітры манеўр праціўніка, Леў Кірылавіч разбіў F-86. На яго рахунку стала 15 збітых самалётаў.

Баявыя дзеянні ў небе Карэі выклікалі вялікія страты з абодвух бакоў – і нашага, і амерыканскага. Вялікія былі страты і ў тэхніцы. Звесткі пра іх супярэчлівыя. Праціўнікі падыходзілі да падлікаў такіх страт тэндэнцыйна: заніжалі свае і перабольшвалі чужыя. Так ці інакш, але гэтыя страты лічыліся не сотнямі, а тысячамі.

ПАН-БЕЛАРУСІКА

ЗША

У Нью-Йорку выйшла ў свет кніга пад назвай "Курапаты" — уражваючы дакумент з археалагічных даследаванняў пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка ва ўрочышчы Курапаты пад Мінскам. Кніга ўключае таксама артыкулы на беларускай і англійскай мовах, якія распавядаюць пра месца пакарання соцень тысяч беларусаў, бязвінных ахвяр бальшавіцкага тэрору трыццатых гадоў.

* * *

У хуткім часе ў ЗША выйдзе ў свет на беларускай мове кніга Яна Максымюка "Беларуская гімназія імя Янкі Купалы ў Заходняй Нямеччыне". Аўтар — стыпендыят нью-йоркскага Фонду імя Любачкі — першы даследчык-гісторык, які разглядае пасляваенныя лёсы беларускай палітычнай эміграцыі ў ФРГ, арганізацыю беларускіх перасяленчых лагераў і г.д. (раней выдаваліся хіба толькі мемуары відавочцаў). У кніжцы асаблівую ўвагу прывабляе і багаты фактаграфічны матэрыял з цікавых першакрыніц, а таксама ўнікальная фатаграфічная дакументацыя.

Польшча

У вёсцы Дашы на Беласточчыне ўрачыста адсвяткавалі 15-годдзе творчай дзейнасці фальклорны ансамбль "Каліна". Сваю мастацкую палітру калектыў пастаянна ўзбагачае новымі формамі не толькі музычнымі, але і літаратурна-сцэнічнымі, дэманструючы разнастайнасць мясцовага беларускага фальклору.

* * *

Гайнаўскі Клуб беларускіх спраў, які гуртуе школьную моладзь, арганізаваў рэгулярны паказ відэазапісаў Фестывалю музыкі маладой Беларусі "Басовішча". Акрамя таго, клуб арганізаваў шэраг цікавых тэматычных сустрэч з вядомымі літаратарамі Янам Чыквіным ("Беларуская літаратура — ці варта чытаць?"), Сакратам Яновічам ("Ці можна быць беларусам у Польшчы?") і іншымі.

* * *

Не толькі культурныя, але і крымінальныя навіны прыходзяць наконт беларускага жыцця ў Польшчы. Вось і нядаўна чарговым разам адбыўся напад на сядзібу Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку. Былі ўкрадзены тры камп'ютэрныя маніторы, ксеракс "Canon", тэлевізар "Sony" і іншая маёмасць. Наўрад ці гэта была палітычная акцыя, але паліцыя ў Польшчы слабавата ахоўвае польскіх беларусаў.

Нямеччына

Сусветнавядомы прафесар Барыс Кіт беларускага паходжання нядаўна прызнаны ганаровым грамадзянінам горада Ляймэна. Разам з нядаўна памёршым Юрыем Попкам ён быў арганізатарам беларускага музея ў гэтым нямецкім горадзе і рэдагаваў выдаваны там часопіс "Весткі Інстытута беларусаведы".

Паводле паведамленняў замежнага друку.

Каб духам кіраваць

Як вядома, праваслаўная царква мае практыку "атрымліваць кадры" з рэлігійных навучальных устаноў Расіі, а каталіцкі касцёл — з Польшчы. Аднак, як ні дзіўна, найбольш трывалую нацыянальную загартоўку будучым беларускім святарам можа даць далёкая Вялікабрытанія.

У тамтэйшым Інстытуце каталіцкіх місіянераў сёння вучацца Ірына Дубянецкая і Караліна Мацкевіч з Мінска, Алесь Беленькі з Беластоку. Практычныя навыкі яны атрымліваюць у прыходзе вядомага і ў нас сваёй самаахвярнай дабрачыннай дзейнасцю візітара для беларусаў-католікаў айца Аляксандра Надсана. Авалодваць адукацыяй беларускім семінарыстам дапамагае і Лонданская бібліятэка імя Ф.Скарыны.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

Нам раяць змяніць менталітэт

Днямі ў Мінску адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Асноўныя пытанні сацыяльнай палітыкі і гаспадарання ў Беларусі і суседніх краінах".

У канферэнцыі ўзялі ўдзел шэраг беларускіх партый дэмакратычнага накірунку, сацыял-дэмакратычныя партыі Усходняй і Заходняй Еўропы, прадстаўнікі прафсаюзаў, дзяржаўных і навуковых устаноў. Абмяркоўваліся пытанні ўласнасці, прыватызацыі і сацыяльнай абароны. Удзельнікі разважалі таксама наконт неабходнасці перамен у менталітэце былога савецкага чалавека пры пераходзе да дэмакратычнага грамадства і свабоднай эканамічнай сістэмы.

(Ул.інф.).

Беларускае адраджэнне ў Літве

У Вільні адбыўся сход грамадзян Літвы, якія маюць намер адрадзіць Беларуска-Літоўскае таварыства, што існавала да вайны ў Коўне і ставіла мэтай збліжэнне беларускага і літоўскага народаў і спрыянне незалежнасці Беларусі.

На сходзе прысутнічала каля 40 чалавек.

БелаПАН.

ПАМЯЦЬ

Чатыры баявыя ўзнагароды ўручыў 23 лютага Пасол Вялікабрытаніі ў Рэспубліцы Беларусь Джон Эверард Таісіі Ковель – нявестцы Мікалая Ігнатавіча Коваля. Сам ветэран з-за дрэннага здароўя не змог прыехаць у Мінск на ўрачыстую цырымонію.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Ігнатавіч служыў у Польскіх узброеных сілах пад брытанскім камандаваннем, праславіўся ў баях. За гэта і быў ўзнагароджаны.

Фота Я.КАЗЮЛІ.

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА



СКАНДАЛ – НЕ ПЕРАШКОДА

Нягледзячы на скандал, які прывёў Вашынгтон і Маскву да крызісу ў дыпламатычных адносінах, Біл Клінтан заявіў, што ён і далей збіраецца садзейнічаць развіццю дэмакратыі ў Расіі і ЗША будуць аказваць дапамогу дэмакратычным працэсам.

Нагадаем, што скандал разразіўся пасля таго, як была затрымана сям'я амерыканцаў, якія перадавалі сакрэтную інфармацыю ў Маскву.

НЕБЯСПЕЧНАЯ ДЫСКУСІЯ

У Францыі абмяркоўваецца ваенная праграма на бліжэйшае дзесяцігоддзе.

Асабліва гарачыя спрэчкі выклікала пытанне пра далейшае выкарыстанне ядзернай зброі. Прэм'ер-міністр Баладур выказваецца за далейшае выпрабаванне ядзернай зброі, тады як прэзідэнт Мітэран катэгарычна супраць гэтага.

МАЛА ПЛАЦЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ Ў НАС

У Заходняй Германіі працягваецца забастоўка металургаў.

Каля 20 тысяч працоўных часова не выходзяць на працу. Галоўная мэта, якой дабіваюцца металургі, — павышэнне зарплаты.

САМЫЯ БРУДНЫЯ

Мадрыд і Афіны — самыя брудныя сталіцы ў Еўропе. Да такога выніку прыйшлі даследчыкі, якія даследавалі еўрапейскія гарады на ступень забруджвання.

Самай жа чыстай сталіцай, паводле іх меркавання, з'яўляецца Лондан.

САМАЯ ВЯЛІКАЯ КАТАСТРОФА

Часопіс "Нью–Йоркер" назваў фільм Арнольда Шварцэнегера "Апошні герой" самай вялікай катастрофай у гісторыі Галівуда.

Высветлілася, што фільм прынёс страты на суму звыш 120 мільёнаў даляраў.

СУПРАЦЬ СМЕРЦІ

ААН заклікала да тэрміновай канфіскацыі і знішчэння супрацьпяхотных мін, агульная колькасць якіх па ўсім свеце складае звыш 100 мільёнаў.

Штомесяц з-за гэтага віду зброі церпяць сотні чалавек, у асноўным, цывільнае насельніцтва і дзеці.

ЗАБОЙСТВА Ў ХРАМЕ

Сама меней 30 палесцінцаў забіты і каля 60 паранены ў выніку нападзення ўзброенага ізраільскага тэрарыста.

Нападзенне адбылося ў час малебна ў "Склепе патрыярха". Тэрарыст, які нападаў, быў апрануты ў вайсковую форму. Выпусціўшы некалькі аўтаматных чэргаў у натоўп вернікаў, ён скончыў самагубствам. ■

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

ТЫДЗЕНЬ ПА ГАРАСКОПУ

28 лютага – 6 сакавіка



РЫБЫ

Панядзелак. Не верце сваім сябрам у гэты дзень, каб у далейшым не шкадаваць.

Аўторак. Будзьце асцярожнымі ў фінансавых справах. Звярніце ўвагу на сваіх дзяцей.

Серада. Пастарайцеся не рызыкаваць нічым. Магчымасць крадзяжу. Непрыемнасці ў каханні.

Чацвер. Творчы ўздым. Праяўляйце больш настойлівасці і характару ва ўсім. Поспех у інтымным жыцці.

Пятніца. Будзьце ўважлівымі ва ўсіх справах. Займіцеся сваім здароўем.

Субота. Удача ў бізнесе.

Нядзеля. Не палохайцеся цяжкасцей і праблем. Удзяліце больш увагі свайму здароўю.

АВЕН

Панядзелак. Займіцеся хатнімі справамі. Пастарайцеся не канфліктаваць з блізкімі.

Аўторак. Будзьце стрыманымі ў сям'і, каб у далейшым не шкадаваць.

Серада. Праявіце больш настойлівасці ў вырашэнні важнай для вас праблемы.

Чацвер. Дыхайце свежым паветрам у гэты дзень. Пастарайцеся не спрачацца з супрацоўнікамі.

Пятніца. У каханні будзьце ўважлівымі і велікадушнымі. З'явіцца шанц на поспех у бізнесе.

Субота. Стрымлівайце свае эмоцыі ў адносінах з блізкімі.

Нядзеля. Будзьце асцярожнымі ў дарозе. Хатнія справы патрабуюць вашай увагі.

ЦЯЛЕЦ

Панядзелак. Займіцеся спортам у гэты дзень. Звярніце ўвагу на сваю нервовую сістэму.

Аўторак. У бізнесе вам лепш не рызыкаваць. Будзьце асцярожнымі ў падарожжах.

Серада. Устрымайцеся ад хуткіх рашэнняў. Верагодна значнае змяненне планаў.

Чацвер. Магчымы праблемы маральнага плана. Лепш не рызыкаваць у фінансавай сферы.

Пятніца. Цяжкасці ў кантактах з калегамі. Поспех у бізнесе.

Субота. Нягледзячы ні на што, вы зможаце дабіцца жаданага выніку. Пазбягайце канфліктаў у сям'і.

Нядзеля. Будзьце стрыманымі ў гутарках са сваімі знаёмымі, каб пазбегнуць непрыемнасцей.

БЛІЗНЯТЫ

Панядзелак. Магчымы грашовыя праблемы. Таму не рызыкуйце нічым.

Аўторак. Не старайцеся зрабіць адразу ўсе справы ў гэты дзень, каб сур'ёзна не захварэць.

Серада. Фінансавы поспех.

Чацвер. Будзьце вельмі ўважлівымі і асцярожнымі на працы.

Пятніца. Паляпшэнне фінансавага становішча. Устрымайцеся ад хуткіх рашэнняў.

Субота. Пастарайцеся ў гэты дзень больш часу правесці на прыродзе. Не злоўжывайце алкаголем.

Нядзеля. Спрыяльны час для забаў.

РАК

Панядзелак. Магчымы няўдачы ў асабістым жыцці. Вам лепш перачакаць.

Аўторак. Вырашыце нейкую важную для вас справу.

Серада. Сяброўскія кантакты дапамогуць вам зняць напружанасць. Паспяховы час для кахання.

Чацвер. Займіцеся разумовай дзейнасцю. Пазбягайце сутыкненняў з ахоўнікамі парадку.

Пятніца. Магчымы фінансавы прыбытак. Але будзе верагоднасць непрыемных выпадковасцей.

Субота. Поспех у бізнесе.

Нядзеля. Не верце нікому ў гэты дзень. Спрыяльны для кахання час.

ЛЕЎ

Панядзелак. Не трэба дзейнічаць аднаму ў гэты дзень — вас падтрымаюць сябры.

Аўторак. Спрыяльны час для самавыяўлення ў любым выглядзе дзейнасці. Поспех у асабістым жыцці.

Серада. У каханні трэба ўмець дараваць. Пастарайцеся не захварэць у гэты дзень.

Чацвер. Пазбягайце канфліктаў з калегамі па працы. Больш часу прысвяціце сваёй сям'і.

Пятніца. У гэты дзень вам дапамогуць сябры і знаёмыя.

Субота. Напружанасць у сям'і, але хутка ўсё вырашыцца.

Нядзеля. Шмат цікавых сустрэч са знаёмымі.

ДЗЕВА

Панядзелак. Стрымлівайце свае эмоцыі на працы.

Аўторак. Пастарайцеся ў гэты дзень больш часу правесці на свежым паветры.

Серада. Каханню ўсе ўзросты пакорныя. Будзьце патрабавальнымі не толькі да сябе, але і да іншых.

Чацвер. Звярніце ўвагу на сваю нервовую сістэму.

Пятніца. Будзьце ўважлівымі на працы. Магчымы перамены ў каханні.

Субота. Магчымы няўдачы ў вашых пачынаннях. Але не праяўляйце залішнюю актыўнасць. Вам лепш выехаць за горад.

Нядзеля. Наведайце царкву ў гэты дзень.

ШАЛІ

Панядзелак. Праяўляйце больш характару і настойлівасці ва ўсім.

Аўторак. Не лепшы час для вырашэння юрыдычных спраў і інтымнага жыцця. Звярніцеся за дапамогай да сваіх сяброў.

Серада. Паклапаціцеся пра сваё здароўе. Магчымы цяжкасці ў рэалізацыі творчых планаў.

Чацвер. Спрыяльны час для заняткаў спортам.

Пятніца. Поспех у каханні. Не злоўжывайце ежай, каб сур'ёзна не захварэць.

Субота. Можаце адправіцца ў нейкае цікавае падарожжа.

Нядзеля. Удача ў інтымным жыцці.

СКАРПІЁН

Панядзелак. Не плануйце ніякіх рашучых крокаў у фінансавай сферы. Уздым сексуальнай актыўнасці.

Аўторак. Будзьце асцярожнымі ў гутарках з даўнімі знаёмымі, каб пазбегнуць непаразуменняў.

Серада. Магчымы матэрыяльны прыбытак. Займіцеся хатнімі справамі.

Чацвер. Звярніце ўвагу на сваё здароўе. Не стаўце сябе ў цэнтр Сусвету ў гэты дзень.

Пятніца. Спрыяльны час для змянення месца працы.

Субота. Пастарайцеся не перанапружваць сваю нервовую сістэму ў гэты дзень.

Нядзеля. Верагоднасць траўм. Будзьце асцярожнымі з агнём.

СТРАЛЕЦ

Панядзелак. Пастарайцеся не пасварыцца ў гэты дзень ні з роднымі, ні з супрацоўнікамі.

Аўторак. Поспех у каханні.

Серада. Не прымайце ніякіх важных рашэнняў у гэты дзень.

Чацвер. Пазбягайце любых рызыкоўных учынкаў.

Пятніца. Не даверайце нікому сваіх фінансавых спраў.

Субота. Пастарайцеся не верыць усяму, што вам скажуць.

Нядзеля. Дайце адпачыць свайму сэрцу.

КАЗЯРОГ

Панядзелак. Спрыяльны час для творчай дзейнасці.

Аўторак. Успомніце ў гэты дзень пра сваіх старых сяброў.

Серада. Займіцеся хатнімі справамі. Будзьце асцярожнымі з агнём.

Чацвер. Вы павінны быць упэўненымі ў сабе. Многае ў інтымных адносінах будзе залежаць ад вас.

Пятніца. Магчымы фінансавы прыбытак.

Субота. Пастарайцеся правесці больш часу ў сям'і.

Нядзеля. Звярніце ўвагу на сваю нервовую сістэму.

ВАДАЛЕЙ

Панядзелак. Асцерагайцеся з блізкімі і супрацоўнікамі.

Аўторак. Нечаканы фінансавы ўздым.

Серада. Праблемы ў каханні і са здароўем. Не злоўжывайце алкаголем у гэты дзень.

Чацвер. Пастарайцеся вырашэнне важных спраў на працы адкласці на іншы час, каб у далейшым не шкадаваць.

Пятніца. Будзьце . асцярожнымі ў бізнесе.

Субота. Устрымайцеся ад хуткіх рашэнняў у гэты дзень.

Нядзеля. З вамі могуць абысціся несправядліва, але не адказвайце тым жа.

АДАМ І ЕВА

Бусел можа пачакаць...

☐ Наталля СТРАЛКОВА, "ЧЗ"

Як атрымаць задавальненне ад інтымнай блізкасці і не зацяжарыць? Як не стаць забойцам уласнага дзіцяці, калі яно знаходзіцца яшчэ ў лоне маці? Як не нараджаць дзяцей больш, чым у стане пракарміць? Адказы на гэтыя пытанні залежаць толькі ад адной рэчы: умелага карыстання правільна падабранымі кантрацэптыўнымі сродкамі. І хоць выбар іх у аптэках пакідае жанчын жадаць лепшага, назваць сітуацыю, якая склалася на сучасным "супрацьзачаткавым" рынку, безнадзейнай нельга. Сведчанне таго — кабінет па планаванню сям'і, адкрыты дваццаць год таму пры Рэспубліканскім цэнтры па праблемах сям'і і шлюбу. Загадвае кабінетам Наталля ШАЦІЛА, адна з нешматлікіх медыкаў, якія спецыялізуюцца сёння ў вышэйназванай праблеме.

— Зараз ужо дакладна вызначана цесная ўзаемасувязь паміж здароўем жанчыны і яе дзетароднай функцыяй. Дваццаць год таму Сусветная арганізацыя аховы здароўя аб'явіла "праграму па рэпрадукцыі чалавека" (інакш кажучы, па узнаўленню гэтай самай функцыі). Больш як 600 вучоных з 85 краін свету працавалі над удасканаленнем метадаў рэгуляцыі нараджальнасці, у выніку чаго і з'явілася новае пакаленне кантрацэптыўных сродкаў з нізкім утрыманнем гарманальных кампанентаў (марвелон, мікрагінон). Яшчэ раней — гадоў сорак таму — была створана сусветная арганізацыя па планаванню сям'і са штабкватэрай у Лондане. Мы ў яе не ўвайшлі і не ўваходзім і сёння. Відаць, таму і робім у планаванні сям'і асноўную "стаўку" на аборт.

Пакуль медыкі 134-х краін б'юцца над удасканаленнем метадаў папярэджання цяжарнасці, да нас па-ранейшаму даносяцца толькі "водгукі". Многія ўрачы не маюць нават паняцця пра тое, якія сучасныя прэпараты існуюць сёння ў свеце і на што нам трэба арыентавацца. Да гарманальных кантрацэптываў адносіны ў пераважнай большасці жанчын насцярожаныя, таму што прывыклі да тыповай думкі: ад іх паўнеюць, яны выклікаюць шэраг непажаданых пабочных эфектаў... Між тым, лекавыя дзеянні гарманальных кантрацэптываў на працягу сарака гадоў статыстычна і практычна даказаны на вопыце многіх краін.

— Наталля Вільгельмаўна, навошта было адкрываць спецыяльны кабінет па планаванню сям'і, калі ў кожнай паліклініцы ёсць жаночая кансультацыя, а пры ёй — гінеколагі?

— Часцей за ўсё жанчына думае, што ў жаночую кансультацыю трэба звяртацца толькі з захворваннямі ці з цяжарнасцю, і там ёй не ўдзеляць дастатковай увагі па праблеме планавання сям'і. У наш кабінет жанчыны звяртаюцца толькі па пытаннях кантрацэпцыі, і доступ сюды больш свабодны. Мы з самага пачатку арыенціруемся на індывідуальны падбор з улікам узросту, палавой актыўнасці, наяўнасці захворванняў і жаданняў абодвух палавых партнёраў. На самым першым прыёме размаўляем з імі не менш за паўгадзіны. (У Злучаных Штатах, напрыклад, на падобную сустрэчу з пацыенткай або мужам і жонкай адводзіцца тры гадзіны).


Я павінна ведаць усё пра фізіялагічныя асаблівасці жанчыны, ад знешніх прыкмет (скажам, празмернай валасатасці) да тых, пра якія вядома толькі ёй (характар цыкла, гарманальна залежныя захворванні і да т.п.) У першую чаргу важна вызначыць супрацьпаказанні для тых ці іншых метадаў кантрацэпцыі, і ўжо ад гэтага ісці далей.

— Колькі год вашым самым маладым пацыенткам?

— Васемнаццаць - дзевятнаццаць. Прыходзяць не толькі тыя, у каго за спінай багаты вопыт інтымнага жыцця, а і дзяўчынкі, якія яшчэ збіраюцца паспытаць, што гэта такое. Я магу толькі вітаць іх цікавасць і заклапочанасць уласным здароўем. Многіх — у асноўным, студэнтак — сюды пасылаюць мамы. І правільна робяць. Васемнаццаць год — той узрост, у якім, згодна з медыцынскімі паказчыкамі палавой сталасці, арганізм жанчыны ў дастатковай ступені падрыхтаваны да інтымных адносін. У тых, хто "не дацярпеў" да гэтай узроставай адзнакі, пачаў палавое жыццё значна раней і з некалькімі партнёрамі, павялічваецца рызыка захворвання на рак шыйкі маткі. Да таго ж, паколькі з "майстэрствам" папярэджання цяжарнасці маладыя амаль не знаёмыя, узрастаюць шанцы на "залёт" і адпаведна з гэтым, на аборт. Пра шкоднасць апошняга і гаварыць не трэба — яна агульнавядомая.

— А якія кантрацэптывы вы параілі б дзяўчынам, якія яшчэ не раджалі і не былі замужам? Калі можна так выказацца, пачынаючым?

— Незамужнім жанчынам я не рэкамендую карыстацца спіралямі — яны павялічваюць рызыку запаленчых працэсаў, а гэта пагражае бясплоднасцю ў будучым. Не забараняю — а проста не рэкамендую. Але ў кожнай жанчыны ёсць права на выбар: пры вялікім жаданні УМС уводзяць і тым, хто не раджаў (безумоўна, пры адсутнасці супрацьпаказанняў). Для дзяўчынак - падлеткаў, калі ў іх не ўсталяваўся менструальны цыкл, не зусім падыходзяць у якасці сродкаў кантрацэпцыі гарманальныя прэпараты. Лепш за ўсё карыстацца тэмпературным (або фізіялагічным) метадам і, безумоўна, прэзерватывам. Апошні дапаможа папярэдзіць не толькі цяжарнасць, а і вельмі непрыемныя і небяспечныя венерычныя захворванні, СНІД. Але усё гэта — агульныя моманты, лепш звярнуцца ў наш кабінет і атрымаць канкрэтную параду.



Калі верыць статыстыцы, кожная пятая жанчына ў нас увогуле ніяк не засцерагаецца, спадзеючыся на "а можа пранясе". У лепшым выпадку, успамінаюць пра спрынцаванне "марганцоўкай" ці растворам воцату. Але ж гэта так нязручна і неэфектыўна, што ўвогуле не вытрымлівае ніякай крытыкі! Жанчыне трэба "ўкласціся" ў рэкордна кароткі тэрмін, — паўтары мінуты.

Што датычыць перарванага палавога акта, да яго я як спецыяліст увогуле стаўлюся крайне адмоўна. Маладыя (і не толькі) мужчыны, якія часта карыстаюцца ім як метадам супраць цяжарнасці партнёркі, потым папаўняюць рады пацыентаў уролага і сексапатолага, скардзяцца на імпатэнцыю і неўрастэнію...

— А ўсім падыходзяць сучасныя гарманальныя кантрацэптывы, пра якія вы нагадалі ў пачатку нашай размовы? Ці можна ім поўнасцю давяраць? Напрыклад, марвелону, які з'явіўся зараз у аптэках?

— Магу з упэўненасцю сказаць, што ён сапраўды адпавядае сусветным стандартам і патрабаванням. Сярод жанчын, якія карысталіся гэтымі кантрацэптывамі, не зарэгістравана ніводнага выпадку цяжарнасці. На заходнім рынку марвелон існуе на працягу ўжо 10 год, і заўсёды карыстаўся і карыстаецца вялікай папулярнасцю. І не толькі таму, што таблеткі вельмі эфектыўна папярэджваюць цяжарнасць — яны, да таго ж, памяншаюць частату ўзнікнення раку яечнікаў і маткі ў два разы, засцерагаюць ад мастапатыі, запаленчых захворванняў жаночых органаў, парушэнняў менструальнага цыкла.

Але перш чым бегчы ў аптэку за марвелонам ці за любым іншым прэпаратам, парайцеся з урачом. Нават самыя лепшыя кантрацэптыўныя сродкі могуць выклікаць пабочныя эфекты, калі яны падабраны няправільна, без уліку супрацьпаказанняў. Каб пазбегнуць непрыемнасцей, прыходзьце да нас, у Рэспубліканскую кансультацыю "Шлюб і сям'я".

— А мужчын вы таксама запрашаеце?

— Ну, паколькі ў назве кабінета ёсць слова "сям'я", значыць, у яе планаванні павінны быць зацікаўлены двое, Ён і Яна. Часцей за ўсё, мужчыны з'яўляюцца ў маім кабінеце ў якасці "маральнай падтрымкі" для сваёй партнёркі ці жонкі, вельмі жыва цікавяцца пабочнымі эфектамі тых ці іншых прэпаратаў, магчымымі ўскладненнямі. Болей бы такіх мужчын, на плечы якіх жанчына можа ўскласці клопаты аб сваім здароўі! Мне вельмі імпануюць падобныя пары, хоць, безумоўна, роля мужчыны ў планаванні патомства і папярэджанні цяжарнасці магла б быць і больш актыўнай. Я маю на ўвазе метад хірургічнай стэрылізацыі мужчын, які пакуль што не знайшоў у нас шырокай падтрымкі. Хаця, скажам, у Англіі на яго прыходзіцца прыкладна 11% ад усіх магчымых метадаў... Але што гаварыць пра замежжа? Там існуюць цэлыя спецыяльныя праграмы па планаванню сям'і, і літаратура, і фільмы, і часопісы для падлеткаў. Кожная падобная праграма падтрымліваецца ўрадам. Мэта — папярэдзіць аборт, захаваць здароўе жанчыны і яе дзяцей.

Мы ж прывыклі да здароўя адносіцца абыякава. Толькі ў адной сталіцы Беларусі робіцца каля дваццаці тысяч абортаў у год (гэта без "вакуумаў", а з імі — усе сорак).

— Жыццё з кожным днём становіцца больш складаным і небяспечным. Здараецца, жанчына, сама таго не жадаючы, трапляе ў сітуацыю, калі «пад рукою» не аказваецца ні таблетак, ні прэзерватыва, ні элементарнай «марганцоўкі», калі не існуе нават самой магчымасці імі пакарыстацца. Я маю на ўвазе згвалтаванне. Як, у такім выпадку, можна пазбегнуць цяжарнасці?

— Дапаможа таблетка пасцінору, калі прыняць яе не пазней за дванаццаць гадзін пасля палавога акта, а таксама спіраль. Апошнюю неабходна ўвесці на працягу 5 дзён з моманту згвалтавання, пры ўмове, што выпадковы партнёр не "ўзнагародзіў" сваю ахвяру венерычным захворваннем.

— А як можна трапіць да вас на прыём?

— Запісацца на любы зручны дзень па тэлефоне 37-16-26.

— Дзякую за размову. ■

Спытайце ў Наташы

"ГУД БАЙ", МОЙ МІЛЕНЬКІ...

"Я яшчэ вучуся ў школе, але ў мяне ўжо ёсць хлопец. Адна дзяўчына (таксама школьніца) праводзіла свайго сябра ў войска, перапісваецца з ім, чакае. Але ў той жа час сустракаецца і з маім хлопцам. Мы з ім сябравалі амаль год. А цяпер ён мяне як бы не заўважае. Летам мы былі разам і адчувалі сябе шчаслівымі... Я не ведаю, што мне рабіць. Калі застаюся адна, увесь час думаю пра яго, вельмі сумую. Са мной гэта ўпершыню. Можа, каханне? У клуб я не хаджу, з іншымі танцаваць таксама не магу, гляджу толькі на яго. Парайце, калі ласка, што рабіць?

Б.Г."

Шаноўная Б.Г.! (Прабач, не ведаю поўнага імя).

Пачну з таго, што "аб'ект" тваіх пачуццяў, мяркуючы па ўсяму, увогуле не варты ніякіх перажыванняў. Пастарайся сябе ў гэтым пераканаць, і пытанне "што мне рабіць?" адпадзе само сабой.

Першае паражэнне на асабістым фронце заўсёды бывае балючым. Рана ці позна яго перажывае кожная. Гэта непазбежна, гэтым трэба перахварэць (як ВРЗ у дзяцінстве). Але не думай, што свет сышоўся клінам толькі на ім адным. Дзякуй Богу, што яго нявернасць ці, скажам, легкадумнасць "усплыла" на паверхню цяпер, а не праз многа год, калі ўжо нічога нельга было б паправіць. Ён здаецца табе адзіным і непаўторным, самым лепшым? Тыповая памылка. Магчыма, ён і "самы", але паколькі адхіліў цябе як жанчыну, паколькі выбраў іншую і адкрыта дэманструе табе сваё новае захапленне — значыць, яго вельмі мала хвалююць твае перажыванні і пачуцці. А ў такім разе, ці варты ён іх? Ці варты твайго суму, дрэннага настрою? Адкрыта праяўляючы іх ("не магу нават танцаваць, увесь час гляджу на яго"), ты даеш яму лішнюю магчымасць пераканацца ў сваёй перавазе над табой.


Цябе кінулі — успрымі паражэнне з высока ўзнятай галавой. Нават калі вельмі хочацца плакаць — усміхайся, не давай яму падставы гаварыць сваім сябрам, што нехта па ім "сохне", і тым больш — кпіць з тваіх пачуццяў.

Час гоіць раны, залечыць і гэту. Дазволь даць адзіную параду на будучыню.

Многія мужчыны ў адносінах да жанчын кіруюцца прынцыпам "надкусанага яблыка". Забаронены плод заўсёды здаецца ім больш салодкім. Нават калі ты будзеш упэўнена ў пачуццях свайго сябра, не адкрывай яму сябе да канца, прымушай сумнявацца ў тваім каханні зноў і зноў, будзь таямнічай, загадкавай і крышачку недасягальнай. А калі паміж вамі ўжо адбылося ўсё, пастарайся не даваць свайму выбранніку падставы глядзець на цябе, як на дасягнутую вяршыню.

Не сумуй. Усё самае лепшае яшчэ наперадзе!

Крыжаслоў



ЗЛЕВА НАПРАВА: 1. Выпуск першых аўтасамазвалаў на Беларускім аўтазаводзе ў Жодзіна. 3. Увод у дзеянне 1-й чаргі 4-га салігорскага калійнага камбіната. 5. Патак першых дэманстрацый рабочых у гарадах Беларусі. 7. Першая публікацыя беларускай паэмы "Тарас на Парнасе" ў газеце "Мінскі лісток". 9. Прэм'ера 1-й савецкай беларускай оперы "Міхась Падгорны" Я.К. Цікоцкага ў будынку Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. 11. Прынядце 1-га Статута Вялікага княства Літоўскага. 13. Адкрыццё будынка Дзяржаўнага цырка БССР. 15. 1-я Усерасійская перапіс насельніцтва ў Беларусі. 18. Адкрыццё 1-й у БССР транспартнай авіялініі Мінск—Глуск—Парычы—Мазыр. 18. Адкрыццё 1-й тралейбуснай лініі ў Мінску. 19. Заснаванне шклозавода "Неман". 20. XXII Алімпійскія гульні ў Мінску па футболу. 21. Пачатак будаўніцтва Мінскага трактарнага завода. 22. Пачатак работы рэспубліканскага выдавецкага "Юнацтва" ў Мінску. 23. Прысваенне Герою Савецкага Саюза П.М.Машэраву звання Героя Сацыялістычнай Працы. 24. 1-ы Усебеларускі фестываль моладзі.

СПРАВА НАЛЕВА: 2. Прыняцце 1-й Канстытуцыі БССР. 4. Адкрыццё Кургана Славы Савецкай Арміі на 21-ым км шашы Мінск-Масква. 6. Пуск першага трамвая ў Віцебску (першага ў Беларусі і Расіі). 8. Адкрыццё АН БССР. 12. Пачатак выдавецкай дзейнасці І.Фёдарава і П.Мсціслаўца на Беларусі. 14. Выхад першай газеты "Мінскі голас". 16. Адкрыццё першай метэаралагічнай станцыі ў Беларусі. 17. Будаўніцтва Агінскага канала, які злучаў басейны Нёмана і Дняпра. 18. Разгром французскіх войск на р.Бярэзіна каля вёскі Студзёнка, што пад Барысавам. 19. Выхад першага нумара газеты "Звязда" ў часы Вялікай Айчыннай вайны. 20. Арбітальны касмічны палёт П.Клімука і В.Лебедзева на караблі "Саюз-13". 21. Выпуск 1-га трактара на Мінскім трактарным заводзе. 22. Стварэнне вытворчага аб'яднання Баларусьнафта ў Гомелі. 23. Гераічная абарона Брэсцкай Крэпасці. 24. Увод у дзеянне 1-й чаргі Светлагорскага цэлюлозна-папяровага завода.

Даслаў Валеры ПІНЧУК.

Адказы на крыжаслоў, змешчаны ў № 20

Па гарызанталі: 4. Галавач. 7. Фразеалогія. 10. Інбер. 11. Палік. 16. Чадра. 17. Наватар. 18. Отрак. 19. Тэндэнцыя. 20. Палеограф. 22. Вітка. 23. Анекдот. 24. Рацыя. 27. Тыпан. 28. Левін. 31. Філантропія. 32. "Блакада".

Па вертыкалі: 1. Хамза. 2. Кавалёнак. 3. Ханок. 5. Арфей. 6. Міраж. 8. Інтрадукцыя. 9. Пікгаграфія. 12. Карэлія. 13. Варыянт. 14. Карагод. 15. "Радавыя". 21. Экліптыка. 25. Фамін. 26. "Сесія". 29. Каала. 30. Роўда.

26, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.25. Надвор'е.
◆8.35. "Ніхто, акрамя цябе".
9.20. Здароўе. Тэлечасопіс.
9.50. Паказвае Гомель.
10.50. Тыдзень планеты. Міжнародны агляд.
◆11.05. "Любоўныя пісьмы з [illegible]".
12.35. "Усе мы родам з дзяцінства".
13.45. Да 75-годдзя транспартнай міліцыі.
14.15. Як чытаць Біблію. Перадача 2-я.
* 14.45. "Мой маленькі поні".
15.15. ПІК.
16.00. "Нов і К"-mon-10.
17.00. [illegible]
17.30. Алімпійскія гульні.
18.30. "Выдатныя маркі аўтамабіляў". 4-я серыя.
19.00. Фестываль аўтарскай песні.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
◆21.50. "Дабрачынны баль".
23.15. НІКа.
23.30. Рэйтынг.
23.50. "Каскад".
0.05. Відзьма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

6.50, 14.00, 20.00. Навіны.
7.05. Ранішняя размінка.
7.15. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
8.05. [illegible]
8.30. "Марафон-15".
8.30. Тэлерадыёкампанія "Мір".
9.55. Ранішняя пошта.
10.25. Смак.
10.40. [illegible]
◆11.10. [illegible]
◆14.25. [illegible]
14.50. [illegible]
15.15. У свеце жывёл.
15.55. Алімпійскія гульні. Фігурнае катанне. Паказальныя выступленні.
18.00. Добрае слова.
18.20. [illegible]
* 18.50. "Цудоўная пара".
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.35. Надвор'е.
◆20.45. "І мора расказала..."
21.40. Дзённік Алімпіяды.
21.55. Алімпійскія гульні. Хакей. Матч за 3–4-е месцы.
У перапынках — Дзённік Алімпіяды; Навіны.
0.25. Надвор'е.
0.30. Алімпійскія гульні. Гарналыжны спорт. Слалам. Жанчыны.

Канал "Расія"

7.55. [illegible] Д/ф.
9.05. Студыя "Рост".
9.35. Пілігрым.
10.20. "Як жыць будзем?"
11.05. [illegible]
◆11.10. Фільмы С.Параджанава. "Колер граната".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
13.20. [illegible]
14.00. На Алімпійскіх гульнях.
16.10. Футбол без граніц.
17.00. Фільм-прэм'ер.
17.20. Зусім сакрэтна.
18.10. [illegible]
18.15. Вуснамі дзіцяці.
18.45. Свята кожны дзень.
◆19.25. [illegible]
21.05. Рэпарцёр.
21.25. Вялікі кур'ер.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. На Алімпійскіх гульнях.
23.35. Праграма "А".

Санкт-Пецярбург

7.00. Інфарм ТБ.
* 7.25. [illegible]
◆7.35. [illegible]
9.25. Канцэрт па заяўках.
9.55. [illegible]
10.30. Хуткая дапамога.
◆11.00. "Міклуха-Маклай".
12.40. Тэледоктар.
13.00. Фестываль лялечных тэатраў.
[illegible]
◆14.40. "Белы Ікол".
16.00. Храм.
16.45. Гістарычны альманах.
17.30. Спартыўны агляд.
18.05. Дарожныя прыгоды.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Камертон.
19.40. Экспрэс-кіно.
20.00. Надоечы.
20.35. Ваш стыль.
◆20.45. "На парозе ночы".
21.35. Фільм-балет.
22.35. Інфарм ТБ.
22.55. [illegible] "Севастопальскі вальс". Спектакль.

8-ы канал

15.05. [illegible]
15.55. [illegible]
◆16.45. [illegible] Тэлесерыял (пайлот).
17.50. [illegible]
* 18.10. Мультфільмы.
◆18.25. [illegible]
◆19.50. "Ліс".
20.30. [illegible]
◆20.45. [illegible]
21.30. [illegible]
◆21.40. "Сем хвілін з Хрыстафорам".
◆21.55. [illegible]
23.15. Праграма відэакліпаў.

27, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.25. Слова да чалавека.
◆8.55. "Дабрачынны баль".
10.20. MTV. Лепшыя гіты.
10.50. Аэробіка.
11.25. АВС-клуб.
11.40. "Усе мы родам з дзяцінства".
◆13.10. [illegible]
14.25. [illegible]
15.10. [illegible]
15.40. Да І Міжнароднага фестывалю фальклору на Беларусі.
* 16.10. "Новая казка".
16.25. Шматгалосся. Народы Беларусі.
17.10. Існасць.
17.40. [illegible]
18.00. "Гінес-шоу".
18.40. [illegible]
19.40. [illegible]
20.00. Панарама.
20.35. Пад купалам Сусвету.
20.40. Калыханка.
21.00. Пяць хвілін на жарты.
21.05. Рэклама.
◆21.10. [illegible]
22.55. "Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар".
23.05. Каралеўскае паляванне.
23.55. Міжнародны турнір па спартыўных танцах.

Канал "Астанкіна"

6.30, 14.00, 23.00. Навіны.
6.50. Ранішняя размінка.
7.00. Гадзіна сілы духу.
8.00. Арт-кур'ер.
8.30. Раным-рана.
9.00. Палігон.
9.30. Тыраж "Спортлато".
9.45. Пакуль усе дома.
10.15. Ранішняя зорка.
11.05. Дэтэктыў-ленд.
11.45. Я — жанчына.
12.15. "Русскій міръ".
* 13.00. "Піф і Геркулес".
13.10. "Падводная адысея каманды Кусто".
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Тэлегном.
* 15.05. "Кот Фелікс" і інш.
15.55. Алімпійскія гульні. Хакей. Фінал. У перапынках — Навіны. Бабслей. Чацвёркі.
18.55. Тэлелоцыя.
19.10. Надвор'е.
◆19.15. "Развод лэдзі Ікс".
21.00. Нядзеля.
21.45. Музыка ў эфіры.
22.40. Дзённік Алімпіяды.
23.20. [illegible]
23.55. Бумеранг.

Канал "Расія"

7.55. Добрай раніцы.
8.25. Наш сад.
8.55. Студыя "Рост".
9.25. Здароўе.
9.55. Аты-баты.
10.25. [illegible] Рэпартажы з "Малой Еўропы".
10.55. На Алімпійскіх гульнях.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00, 19.00, 22.35. Весткі.
13.20. На Алімпійскіх гульнях.
14.15. [illegible]
14.35. "Не высечы..."
15.10. Лепшыя гульні НБА.
15.50. Белая варона.
16.35. Каробка перадач.
* 16.55. "Гуфі і яго каманда" і "Чорны плашч".
17.50. "Гарадок". Пацешальная праграма.
18.15. У Ксюшы.
18.45. Свята кожны дзень.
◆19.25. [illegible]
21.05. Закрыццё Алімпійскіх гульняў.
22.35. Аўтаімгненне.
22.40. Зоркі гавораць.
22.55. "Снежаньскія вечары". [illegible]

Санкт-Пецярбург

7.00. "Гаючае слова". Праграма-набажэнства.
◆7.30. "На парозе ночы".
8.20. "Сэрэнада".
8.45. "Рамэо і Джульета". Фільм-балет.
9.10. Экспрэс-кіно.
9.25. Армія Расіі.
10.00. Фестываль лялечных тэатраў "Неўскі Н'еро".
11.20. Нядзельны лабірынт.
* 13.20. "Ранішняя песенька".
13.35. Залаты ключ.
13.45. Казка за казкай.
14.15. Сувораўскі салдат.
◆15.00. "Гульня з невядомым".
16.35. Крымінальнае дасье.
16.55. Сем сланоў.
17.25. Зебра.
18.30. Інфарм ТБ.
◆18.55. "Конь белы". 1-я серыя.
20.00. Вынікі.
21.05. Ваш стыль.
21.10. Наша кіно. "Мордачка".
22.45. "Адам і Ева +".

28, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

9.55. Пад купалам Сусвету.
10.05. Пяць хвілін на жарты.
* 10.10. Мультфільмы.
10.30. "Выдатныя маркі аўтамабіляў".
◆11.00. [illegible]
11.50. [illegible]
13.30. Навіны.
13.40. Дзелавая хроніка.
16.45. ТБ — школе. Веснавыя народныя святы.
17.00. [illegible]
17.30. [illegible]
18.10. Абласныя навіны (Брэст).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. [illegible]
19.35. [illegible] Спектакль.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Квенцін Дарвард".
22.30. Студыя "Тэлесябрына".
22.55. Спартыўны тэлекур'ер.
23.00. Надвор'е.
23.25. НІКа.
23.40. [illegible]

Канал "Астанкіна"

17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
17.25. "Шок".
17.45. Дакументы і лёсы.
[illegible]
18.25. Надвор'е.
18.40. [illegible]
19.10. За Крамлёўскай сцяной.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.35. "Ты шчаслівы тым, Рудольф Нурыеў?" В.Вульф.
21.50. Прэс-клуб.
[illegible]

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
6.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30. Формула-730.
7.00. Новая лінія.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Паехалі.
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
[illegible]
12.40. Сялянскае пытанне.
◆13.25. [illegible]
14.55. Тэлегазета.
15.00. Бізнес у Расіі.
15.30. Там-там навіны.
15.45. Новая лінія.
[illegible]
17.45. Інфарм ТБ.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
[illegible]
22.40. Аўтаімгненне.

Санкт-Пецярбург

7.00. Тэледоктар.
[illegible]
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
23.10. "Скачок анёла". Д/ф.

1, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Спартыўны тэлекур'ер.
9.00. ТБ — школе. Веснавыя народныя святы.
◆9.15. "Квенцін Дарвард".
10.15. "Пакуль дыхаю, спадзяюся". Нав.-папулярны фільм.
10.35. Рок-айленд-шоу.
11.45. Мультфільмы.
12.20. Тэлевізійны Дом кіно.
13.30. Навіны.
13.40. Дзелавая хроніка.
16.00. "Нов і К"-mon-10.
17.00. ТБ — школе. Гісторыя Беларусі.
17.30. Да 75-годдзя крыміналістычнай службы.
18.00. Дзелавая хроніка.
18.10. Абласныя навіны (Віцебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачытайце маё пісьмо...
19.05. Эканамічная хваля.

Канал "Астанкіна"

5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
7.45. Агляд рынку нерухомасці.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
[illegible]
◆8.40. "Проста Марыя".
[illegible]
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Гарачаў і іншыя".
[illegible]

Канал "Расія"

[illegible]

Санкт-Пецярбург

[illegible]
22.15. "Забытыя мясціны". Д/ф.
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
23.10. Сам-насам з музыкай.
23.55. "Еўрапейскі калейдаскоп".
0.25. "Скрыпач". Муз.фільм.

2, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. "Максім Гарэцкі". Д/ф.
9.00. ТБ — школе. Гісторыя Беларусі.
◆9.30. "Ніхто, акрамя цябе".
10.15. Аэробіка.
10.50. Фестываль імя І.І.Салярцінскага.
12.40. Тарас Шаўчэнка.
13.30. Навіны.
16.00. Відзьма-нявідзьма.
17.00. Танцуе ансамбль "Равеснік".
17.45. Парады агароднікам.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Крок". Карамболь.
19.35. Погляд у будучыню. Жыллёвая праблема.
20.10. Фільм-канцэрт.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Ніхто, акрамя цябе".
22.20. На сесіі ВС Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам Сусвету; Пяць хвілін на жарты; Надвор'е; А.Дворжак. Сімфонія № 9 "З новага свету".

Канал "Астанкіна"

5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
7.45. Агляд рынку нерухомасці.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
8.20. Сарока.
◆8.40. "Проста Марыя".
9.30. Эстрадны канцэрт.
9.40. У свеце жывёл.
10.20. Джэм.
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Гарачаў і іншыя".
14.25. Прадпрымальнік.
15.20. "Том Сойер".
15.50. Джэм.
* 16.20. "Лятаючы дом".
16.50. Загадка СБ.
17.00. Навіны.
17.25. Тэлерадыёкампанія "Мір".
17.50. Дакументы і лёсы.
17.55, 21.30. Надвор'е.
◆18.00. "Проста Марыя".
18.50. Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Спартак" (Масква) — "Барселона" (Іспанія).
У перапынку (19.45) — Добрай ночы, малышы!
◆21.40. "Сэрца не камень". 2-я серыя.
22.50. Прэс-экспрэс.
23.10. Максіма.
23.45. Футбол. Ліга чэмпіёнаў.

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
6.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30. Формула-730.
7.00. Новая лінія.
7.20. Час дзелавых людзей.
* 7.50. "Страшыдла".
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
8.30. Без рэтушы.
12.40. Сялянскае пытанне.
◆13.25. "Кукарача".
14.55. Тэлегазета.
15.00. Суседзі па планеце.
15.30. Там-там навіны.
15.45. Студыя "Рост".
16.15. Новая лінія.
17.00. Мір і вайна.
17.30. Азы кар'еры.
17.45. Расійская энцыклапедыя.
18.15. "Настальжы" — музыка ўсіх пакаленняў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. L-клуб.
21.15. Зала чакання.
22.05. Экран крымінальных паведамленняў.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Тэлевізійны тэатр Расіі.

Санкт-Пецярбург

6.30. Інфарм ТБ.
* 6.50. "Баявы конік" і іншыя.
◆7.15. "На парозе ночы".
8.10. Урок нямецкай мовы.
8.25. "У ільдах акіяна". Д/ф.
9.30. Пскоўскі трыпціх.
10.05. Там, дзе жыве Павуціныч.
10.25. Перадвыбарная інфармацыя.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Сярэбраная ніць.
11.30. Інфарм ТБ.
11.40, 14.25, 18.05, 20.40, 0.50. Музычны момант.
◆11.45. "Міклуха-Маклай".
13.25. "Лясная быль".
14.30. Інфарм ТБ.
14.40. Сам-насам з музыкай.
15.25. Дамашні ўрок.
16.00. Чэмпіянат Расіі па міні-футболу.
17.15. Ваша права.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Перадвыбарная інфармацыя.
19.00. Выбары. Прамы эфір.
20.00. Сёння.
20.35. Тэлемагазін.
◆20.45. "Конь белы". 2-я серыя.
21.35. Да юбілею Ірыны Багачовай.
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
23.10. "Карыфеі". Брус Спрынгсцін.
0.05. Фільм-канцэрт.

3, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. Фільм-канцэрт.
◆9.15. "Ніхто, акрамя цябе".
10.00. Фільм-балет.
11.10. Роднае слова. Тэлечасопіс.
◆11.40. "Фірма прыгод".
13.30. Навіны.
16.45. ТБ — школе. Музыка.
17.00. Фестываль спартыўных танцаў.
17.50. Гаспадар.
18.10. Абласныя навіны (Гродна).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачытайце маё пісьмо...
19.05. Бізнес-рынг.
19.35. Аздараўленне дзяцей з забруджаных раёнаў Беларусі.
20.05. Пазіцыя ўрада.
20.20. Сёння — нацыянальнае свята Рэспублікі Балгарыі.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Ніхто, акрамя цябе".
22.20. На сесіі ВС Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам Сусвету; Пяць хвілін на жарты; Надвор'е.

Канал "Астанкіна"

5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
7.45. Агляд рынку нерухомасці.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.35. Навіны.
* 8.20. "Ранішняя музыка".
◆8.30. "Проста Марыя".
9.20. Футбол. Ліга чэмпіёнаў.
10.10. ...Да 16 і старэйшым.
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Гарачаў і іншыя".
14.25. Прадпрымальнік.
* 15.20. "Том Сойер".
15.50. Песні Г.Завалокіна.
16.10. ...Да 16 і старэйшым.
16.50. Тэхнадром.
17.00. Навіны.
17.25. Лабірынт.
17.50. Дакументы і лёсы.
18.00, 20.35. Надвор'е.
◆18.05. "Проста Марыя".
18.55. Кінапанарама.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Лато "Мільён".
◆21.15. "Царскае паляванне". 1-я серыя.
22.25. Прэс-экспрэс.
22.45. "Царскае паляванне". 2-я серыя.
23.55. Футбол. На шляху да Уэмблі.

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
6.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30. Формула-730.
7.00. Новая лінія.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Паехалі.
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
◆11.00. "Санта-Барбара".
12.40. Сялянскае пытанне.
◆13.25. "Ганна і Камандор".
* 14.45. "Ай, ай, ай".
14.55. Тэлегазета.
15.00. Паралелі.
15.15. Канцэрт.
15.30. Там-там навіны.
15.45. Студыя "Рост".
16.15. Новая лінія. "Штрыхі да партрэта".
17.00. М-трэст.
17.15. У двух кроках ад "Ямы".
17.30. "Успомніце, дзеці..." В.Бяркоўскі.
18.00. Будні.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Кіно ў сакавіку.
20.40. Сам сабе рэжысёр.
21.15. Сола.
22.05. Экран крымінальных паведамленняў.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. З залы Вярхоўнага Суда РФ.
23.10. Рамансы на вершы А.С.Пушкіна.
23.25. Астралогія кахання.

Санкт-Пецярбург

6.30. Інфарм ТБ.
* 6.55. "Васьміножкі".
7.05. "Дажды нам днесь".
8.30. "Еўрапейскі калейдаскоп".
9.00. Новы Пецярбург.
9.30. Пскоўскі трыпціх. Перадача 2-я.
10.00. Там, дзе жыве Павуціныч.
10.25. Перадвыбарная інфармацыя.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Сем сланоў.
11.30. Інфарм ТБ.
11.40, 14.25, 18.05, 20.40, 1.50. Музычны момант.
11.45. Тэлемагазін.
◆11.50. "Дзяўчаты з Сагдыяны".
13.10. "Нургушскі заказнік". Д/ф.
13.25. Храм.
14.30. Інфарм ТБ.
14.40. Гістарычны альманах.
15.25. Дамашні ўрок.
15.55. Урок нямецкай мовы.
* 16.10. "Раскажыце казку, доктар".
16.50. Дзецям пра зверанят.
17.10. Усё могуць каралі...
17.30. Рэформа і ўлада.
◆18.10. Вялікі фестываль.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Перадвыбарная інфармацыя.
19.00. Выбары. Прамы эфір.
19.45. Спорт, спорт, спорт.
20.00. Сёння.
20.35. Тэлемагазін.
◆20.45. "На парозе ночы".
21.40. "Начны Эрмітаж". Д/ф.
21.50. Музычны ангажэмент.
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
23.10. Музычны канал.
0.25. "Дон Жуан". Фільм-спектакль.

4, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. "Спявае Алена Камбурава."
9.00. ТБ — школе. Музыка.
◆9.15. "Ніхто, акрамя цябе".
10.00. Карамболь.
10.35. Пазіцыя ўрада.
10.50. "Партрэт каханай жанчыны". Д/ф.
* 11.30. "Добрая казка".
11.45. Кінаальманах.
12.30. Студыя "Тэлесябрына".
13.30. Навіны.
13.40. Дзелавая хроніка.
15.50. Голас.
16.50. Дзелавая хроніка.
17.00. Канцэрт, прысвечаны Дню беларускай міліцыі.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Міліцыя? Міліцыя!" Святочная праграма.
20.00. Дом для чалавека.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Ніхто, акрамя цябе".
22.20. На сесіі ВС Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Пад купалам Сусвету; Пяць хвілін на жарты; Надвор'е; "Румба".

Канал "Астанкіна"

5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
* 7.45. "Вожык, сабака і хлопчык Ніка".
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
◆8.20. "Гадзіннік капітана Энрыка".
9.35. 25 гадоў аркестру "Баян".
10.20. Амерыка з М.Таратутам.
10.50. Прэс-экспрэс.
◆11.20. "Гарачаў і іншыя".
14.25. Брыдж.
14.45. Дзелавая хроніка.
14.55. Бізнес-клас.
15.10. "Крокі насустрач".
◆15.35. "Гадзіннік капітана Энрыка".
16.50. Азбука ўласніка.
17.00. Навіны.
17.25. Навіны культуры.
17.35. Чалавек і закон.
18.00, 20.35. Надвор'е.
18.05. Амерыка з М.Таратутам.
18.35. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
◆20.45. "Каплан" (Францыя–Швейцарыя).
22.15. Чалавек тыдня.
22.30. Акадэмія.
23.10. Прэс-экспрэс.
23.20. Музагляд.

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
6.25. Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30. Формула-730.
7.00. Новая лінія.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Паехалі.
8.00. Навіны Эй-бі-сі.
◆11.05. "Санта-Барбара".
11.55. Белая варона.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.25. Тэлевізійны тэатр Расіі.
14.55. Бізнес у Расіі.
15.25. Там-там навіны.
15.40. "Гарадок".
16.05. Новая лінія.
◆16.50. "Полі". 2-я серыя.
17.45. Глобус.
18.15. Багіні кахання. Моніка Віці.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Замак у Швецыі".
21.30. "К-2".
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Вячэрні салон.

Санкт-Пецярбург

6.30. Інфарм ТБ.
* 6.50. "Самая салодкая дыня".
◆7.05. "На парозе ночы".
8.00. "Вячэрні звон". Музычны канал.
9.00. Пскоўскі трыпціх. Перадача 3-я.
9.30. Рэформа і ўлада.
10.05. Урок нямецкай мовы.
10.25. Перадвыбарная інфармацыя.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00 Усё могуць каралі...
* 11.20. "Васьміножкі".
11.30. Інфарм ТБ.
11.40. "Табольская разная косць".
11.55, 14.25, 18.05, 20.40, 1.45. Музычны момант.
◆12.45. Да 90-годдзя з дня нараджэння А.Згурыдзі. "Гульня з невядомым".
14.30. Інфарм ТБ.
14.40. Неразведзеныя масты.
◆15.10. "Лясная сімфонія".
16.00. Д/ф "Графіка".
16.30. В.Біянкі — 100 гадоў.
17.00. "На сямі вятрах". Перадачы 1-я і 2-я.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30 Інфарм ТБ.
18.55. Перадвыбарная інфармацыя.
19.00. Выбары. Прамы эфір.
20.00. Сёння.
20.35. Тэлемагазін.
◆20.45. "Конь белы". 3-я серыя.
21.35. Хранограф.
22.15. Наабум.
22.40. Ваш стыль.
22.45. Інфарм ТБ.
◆23.10. "Бывай, малышка".
0.40. "Агрыпіна Ваганава".

5, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.25. Надвор'е.
◆8.35. "Ніхто, акрамя цябе".
9.20. Паказвае Віцебск.
10.15. Народы Беларусі.
* 10.50. Мультфільм.
11.00. Тыдзень планеты.
◆11.15. "Румба".
12.45. 20 мінут рэдактара.
◆13.05. "Першы ўзвод".
14.35. Кінанарыс.
* 14.45. Мультфільм.
15.15. ПІК.
16.05. Праблемы забеспячэння насельніцтва медыкаментамі.
16.50. Вобраз.
17.50. Паэт-песеннік М.Траццякоў.
19.05. "Выдатныя маркі аўтамабіляў".
19.35. "Нов і К"-mon-10.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
◆21.50. "Кол — шалёны сабака".
23.35. Рэйтынг.
23.55. "Каскад".
0.10. НІКа.
0.25. Відзьма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

5.20. Ранішняя размінка.
* 7.45. Мультфільм.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.30. Навіны.
8.25. Тэлерадыёкампанія "Мір".
9.50. Агарод — круглы год.
10.20. Зорная гадзіна.
14.25. Прадпрымальнік.
15.10. Свята казкі.
15.50. Зорная гадзіна.
16.30. Аўта-шоу.
16.50. Тэхнадром.
17.25. Дакументы і лёсы.
17.30. "Эрмітаж".
18.00. Рэха тыдня.
18.30. Канцэрт ансамбля танца Украіны імя П.Вірскага.
18.55, 20.35. Надвор'е.
19.00. У пошуках страчанага. Рына Зялёная.
19.40. Добрай ночы, малышы!
◆20.45. "Філін і кошачка".
22.40. Галіна Вішнеўская ў Астанкіна.
23.30. Тысяча і адна ноч.

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
◆11.20. "Закаханыя".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.25. Аніматограф.
15.05. Чатырыста гадоў музыкі.
15.40. Тэлегазета.
15.45. Новая лінія.
16.20. Футбол без граніц.
17.15. Фільм-прэм'ер.
17.30. Майстры. Таццяна Лаўрова.
18.15. Вуснамі дзіцяці.
18.45. Свята кожны дзень.
◆19.25. "Жанчына для ўсіх".
* 20.50. "Помнік".
20.55. Прэм'ера відэафільма "Сталін з вамі?"
21.30. Джэнтльмен-шоу.
22.00. Рэпарцёр.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Праграма "А".

Санкт-Пецярбург

◆8.55. "Аповесць пра лясного велікана".
* 10.10. "Разбойнікі і музыканты".
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Канцэрт па заяўках.
11.30. Інфарм ТБ.
11.40. Тэледоктар.
◆11.55. "Каралева бензакалонкі".
13.20. Сярэбраная ніць.
13.50. "Мелодыя экрана". Музычны фільм.
14.30. Інфарм ТБ.
14.40. Сёння і штодзённа.
15.00. Розпакалярова сабака.
15.15. Гістарычны альманах.
16.00. Хакей. Чэмпіянат МХЛ. СКА–"Тарпеда". У перапынках (16.35.)–Спартыўны агляд. (17.25)– Вялікі фестываль.
18.20. Дарожныя прыгоды.
18.30. Інфарм ТБ.
18.55. Камертон.
19.40. Экспрэс-кіно.
20.00. Надоечы.
20.35. Ваш стыль.
◆20.40. "На парозе ночы".
21.30. Тэатральная правінцыя.
22.35. Інфарм ТБ.
22.55. Футбольна-забаўляльнае шоу.
23.50. Фільм-канцэрт.
0.45.–1.15. Фільм-канцэрт.

6, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.25. Слова да чалавека.
8.55. Пяць год пасля Афганістана.
◆9.40. "Кол — шалёны сабака".
11.25. Аэробіка.
12.00. Настольны тэніс. Чэмпіянат Беларусі. Фінал мужчынскага адзіночнага разраду.
12.50. MTV. Лепшыя гіты.
13.20. АВС-клуб.
13.35. "Беларусы ў Амерыцы". Перадача 4-я.
14.20. Нядзельнае тэлекафэ "Мая мама".
15.05. Існасць.
15.35. Сустрэча з Уладзімірам Ухцінскім.
* 16.20. "Падарунак для слана".
◆16.30. "Падкідыш".
17.40. "Гінес-шоу".
18.10. Грамадская думка. Прамая лінія.
19.40. Студыя "Тэлесябрына". Падарункі на добры настрой.
20.00. Панарама.
20.35. Пад купалам Сусвету.
20.40. Калыханка.
21.00. Пяць хвілін на жарты.
21.05. Рэха Алімпіяды.
◆21.50. "Сваякі" (Францыя).
23.35. "Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар".
23.45. Каралеўскае паляванне.

Канал "Астанкіна"

8.00. Без паўзы.
8.30. Раным-рана.
9.00. Палігон.
9.30. Тыраж "Спортлато".
9.45. Пакуль усе дома.
10.15. Ранішняя зорка.
11.05. Новае пакаленне...
11.45. Пад знакам "пі".
12.30. Правінцыя.
* 13.00. "Піф і Геркулес".
13.10. "Падводная эдысея каманды Кусто".
14.00, 17.30, 22.45. Навіны.
14.20. Тэлерадыёкампанія "Мір".
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Шпаргалка.
* 15.55. "Кот Фелікс", "Сапраўдныя паляўнічыя на прывіды" (ЗША).
16.45. Панарама.
17.25. Жывое дрэва рамёстваў.
17.45. Смехапанарама.
18.35. Тэлелоцыя.
18.50. Надвор'е.
* 18.55. "Мудрасць беднай дзяўчыны".
◆19.05. "Непапраўны" (Францыя).
21.00. Нядзеля.
21.45. Спартыўны цік-энд.
22.00. Баль кіназорак.
22.55. Прамéнад у Марыінскім.
23.40. Кабарэ "Сінія ночы". Музычна-пацяшальная праграма.
0.15. Вялікая прагулка.

Канал "Расія"

8.00. Добрай раніцы, Еўропа.
8.30. Вялікі хакей.
9.00. Студыя "Рост".
9.30. Пілігрым.
10.15. Аты-баты...
10.45. Рэпартажы з "Малой Еўропы".
◆11.15. "Закаханы па ўласнаму жаданню".
12.40. Шэсць сотак.
13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
13.20. "Не высечы..."
13.35. Вечары ў доме Гогаля.
14.05. Каробка перадач.
14.20. Гранд-Рэпартаж. "Дамы і кабеткі".
14.50. Лепшыя гульні НБА.
15.50. У свеце жывёл.
* 16.55. "Гуфі і яго каманда", "Чорны плашч".
17.50. "Расія маладая".
18.45. Свята кожны дзень.
◆19.25. "Прынцэса Клеўская".
21.40. У Ксюшы.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
22.55. Спявае І.Оціева.

Санкт-Пецярбург

8.25. Пецярбургскі ангажэмент.
9.10. Фільм-канцэрт.
9.40. Экспрэс-кіно.
9.55. Новыя часы.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Нядзельны лабірынт.
13.05. "Успамінаючы Барыса Пастэрнака". Д/ф.
14.30. "Баявы коннік".
◆14.40. "Рыкі-Цікі-Таві".
15.55. Залаты ключ.
◆16.05. "Нягоднік".
17.35. Крымінальнае дасье.
17.55. О-ля-ля.
18.30. Інфарм ТБ.
18.50. "Я служыў у апараце Сталіна, або Песні алігархаў".
20.00. Вынікі.
21.05. Ваш стыль.
◆21.10. "Конь белы". 4-я серыя.
22.00. Адамаў яблык.
23.05. "Клод Ларэн". Д/ф.
23.35. Фільм-канцэрт.

Каб зэканоміць ваш час:
◆ мастацкія фільмы
* мультфільмы

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць пастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

КІНААФІША МІНСКА

26 лютага

«МАСКВА»: "Узыходзячае сонца" (2 с.)*** — 16.40, 19.00. "Надта прыгожыя, каб жыць"*** — 17.00. "Свавольнік з псіхушкі" — 10.40 (л), 21.20. "Свабоднае падзенне"*** — 12.40. У шоу-праграме "Парадыз" — зорка маскоўскай эстрады Валерыя — 23.00 (толькі 26-га).

"КАСТРЫЧНІК»: "Узыходзячае сонца" (2 с.)*** — 14.40, 18.20. "Паветраны пацалунак"*** — 13.00 (27-га — л.). "Бабнік-2"** — 17.00, 20.40. Музычна-пацяшальная праграма "Макс-шоу" — 21.30.

«АЎРОРА»: "Самсон і Салі" (д) — 10.00. "Зачараваны даляр" (д) — 14.00. "Моцны арэшак-2" (1,5 с.)** — 12.40, 14.50, 17.00, 19.20, 21.20. "Кроў і пясок"*** — 11.40, 19.30, 21.10. "Я і Ён"*** — 15.50, 17.40.

«БЯРЭСЦЕ»: "Моцны арэшак-2" (1,5 с.)** — 11.50, 15.40, 19.30. "Кроў і пясок"*** — 14.00, 17.50, 21.40. "Мядовы месяц у Лас-Вегасе"*** — 11.30, 15.00, 18.30. "Самыя шалёныя ў свеце пілоты" — 13.10, 16.40, 20.20.

«ВІЛЬНЮС»: "Моцны арэшак-2" (1,5 с.) — 11.50, 17.20, 21.00. "Кроў і пясок"*** — 14.10, 19.30. "Ранняя сталасць, ці Хлопчык-лавелас" — 15.40 (27-га — л.). Відэазала: 13.10, 15.15, 17.20, 19.25, 21.30.

«ДРУЖБА»: "Манашкі ў бягах" — 12.10 (27-га — л.), 15.30, 18.50. "Мядовы месяц у Лас-Вегасе"** — 13.50, 17.10, 20.30. Відэазала: "Мацнейшы ўдар" (баявік) — 13.00, 16.20. "Гонар і лютасць-2" (баявік) — 14.40, 17.50. Інфармацыйна-пацяшальная праграма — 19.30.

«ПАРТЫЗАН»: "Амністыя" (да 70-годдзя Беларускага кіно) — 10.30 (бяспл.сеанс). "Узыходзячае сонца" (2 с.)*** — 12.10, 19.20. "Паветраны пацалунак"*** — 16.10. "Наёмны забойца" — 10.30, 14.30, 17.40, 21.40.

«ПЕРАМОГА»: "Моцны арэшак-2" (1,5 с.)** — 11.40, 15.40, 18.00. "Кроў і пясок"*** — 10.00, 13.50, 20.20. Інфармацыйна-пацяшальная праграма — 21.00. Відэазала: "Паліцэйскі па-за законам" — 10.00, 11.40, 13.20, 15.00, 16.40, 18.20. Відэабар працуе з 10.00 да 16.00 і з 17.00 да 23.00.

«САЛЮТ»: "Узыходзячае сонца" (2 с.)*** — 13.25, 15.40, 17.55, 22.00 (н). "Паветраны пацалунак"*** — 10.00. "Дзейнічай, Маня!" (1,5 с.) — 11.30, 20.10.

«СУЧАСНІК»: "Дзейнічай, Маня!" (1,5 с.) — 12.00, 14.00. "Эмануэль"**** — 16.00, 17.40, 19.20, 21.00.

«БЕЛАРУСЬ»: "Моцны арэшак-1" (2 с.)** — 12.40, 15.00, 17.20, 19.40. "Жанчына ў полымі" — 12.30, 14.20, 17.50. "Міс Катастрофа" — 11.00, 16.10. "Споведзь палюбоўніцы" — 10.50. Інфармацыйна-пацяшальная праграма — 20.00.

«КІЕЎ»: "Татальнае сачэнне" — 13.00 (толькі 26-га — л.), 15.00. "Японская лэдзі Чатэрлей"**** — 17.00, 18.50, 20.30.

«КАМСАМОЛЕЦ»: "Роня — дачка разбойніка" (д) — 10.30. "Паляўнічыя на монстраў" — 13.00, 16.30, 19.40, 21.00. "Манашкі ў бягах" — 11.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00. "Мая мачаха — іншапланецянка" (1,5 с.) — 12.00, 17.40. "Мужчынскі зігзаг" — 15.00.

«МІР»: "Мужчынскі зігзаг" — 14.00. "Мая мачаха — іншапланецянка" (1,5 с.) — 11.00, 15.00, 19.00. "Няма куды больш бегчы" — 13.00, 17.00, 20.50. "Манашкі ў бягах" — 12.00, 16.00, 18.00, 20.00. У кінатэатры працуе відэазала.

«ПІЯНЕР»: "Прынц Хадон і прынцэса Ранран" (д) — 10.00, 13.30. "Сегун Маэда" — 11.30. "Школа сцюардэс" — 15.00, 16.40. "Паўночная гарачыня"*** — 18.20. Танцавальна-пацяшальная праграма — 20.00. Відэазала: "Рабатэх-1" (д) — 10.00. "Сканеры-3" — 11.20, 15.00. "Чужыя грошы" — 13.10, 17.00.

«РАКЕТА»: "Равучы агонь" — 12.00. "Сямейства Дракулы"*** — 14.00, 17.20. "Гарачае лета"**** — 15.40, 19.00, 20.40.

«РАДЗІМА»: "Я і Ён"*** — 12.00, 15.40, 19.40, 21.00. "Сэрцы трох-2" (2 с.) — 13.30, 17.10. Відэазала: "Непераможная прынцэса Шы-Ра-5" (д) — 16.30. "Цяжкая мішэнь" — 18.00. "Трэска" — 20.00.

«ЗМЕНА»: "Два асілкі" і інш.мультфільмы (д) — 12.00. "У ложку з ворагам"*** — 16.10, 18.00. "Пераступіўшы мяжу"** — 14.00, 19.50.

"ЦЭНТРАЛЬНЫ»: "Манашкі ў бягах" — 13.20, 16.15, 17.50, 21.00. "Золата"*** — 10.30, 19.25. "Мужчынскі зігзаг" — 12.00, 14.55.

«ЭЛЕКТРОН»: "Нявеста падземнага прынца" (д) — 11.00. "Няма куды больш бегчы" — 14.00, 15.40, 17.20, 19.00. "Клас 1999"*** — 14.40, 16.20, 19.40. "Я і Ён"*** — 11.20, 13.00, 18.00. Інфармацыйна-пацяшальная праграма — 20.30.

«АВАНГАРД»: "У ложку з ворагам"*** — 15.00, 19.00. "Сямейства Дракулы"*** — 17.00.

«ЗНАМЯ»: "Ніндзя правіцеля" — 12.30, 15.30, 17.00. "Сямейства Дракулы"*** — 11.00, 14.00, 18.30, 20.00.

«УДАРНІК»: "Сэрцы трох-2" (2 с.) — 13.00, 18.40. "Пераступіўшы мяжу"** — 15.20, 17.00.

Заснавальнікі: ЦК СМБ, калектыў рэдакцыі газеты "Чырвоная змена". Выдавец: газетна-выдавецкае закрытае акцыянернае таварыства "Маладзік". 220013 г.Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Газета ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Набрана і зверстана ў наборна-выдавецкім бюро "ЧЗ". Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку", 220013, г.Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79. Выходзіць у аўторак, чацвер і суботу.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў. [illegible]

Час падпісання ў друк: па графіку — 19.20, падпісана — 19.20.
М. 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П. 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Індэкс 63129. Тыраж 65 500. Зак. 23.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 г.МІНСК, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 68-26-27; [illegible]

Расцэнкі на рэкламу ў газеце: I паласа —5000 руб./кв.см, IV паласа — 4000 руб./кв.см.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Сяргей БАЛЦЕВІЧ (адказны сакратар), Валянцін БАРЫСЕВІЧ, Валерый ВАРАНЕЦКІ, [illegible] Наталля СТРАЛКОВА, Кузьма ШАПЛЫКА, Вольга ШАЎКО.

Галоўны рэдактар Уладзімір БЕЛЬСКІ